153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 102 (5476)
СЕРАДА
6
МАЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б — АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — НА ВЫДАТНА ЗАВЯРШЫМ СЯЎБУ.
Я. З. ГЕРАЎКЕР — АБ КАЛГАСНЫХ ХАТАХ-ЛАБАРАТОРЫЯХ.
ПЛАТОН ГАЛАВАЧ — ПЕРШЫ ДОПЫТ.
Р. ДОДЗІН, І. ФЕЛЕР — СТАХАНАЎЦЫ Ў ГАЗЕЦЕ.
А. ЛОСЬ — БРЫГАДА ОРДЭНАНОСЦА.
І. КАВАЛЕЎ — РЫХТАВАЦЬ ПІСЬМЕННАГА ЎСЕБАКОВА ПАДРЫХТАВАНАГА НАСТАЎНІКА.
А. М. — МЯДЗВЕЖАЯ ПАСЛУГА.
Р. ФРАЛОЎ — КАЛІ НЕ ВЕДАЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ.
ЗА РУБЯЖОМ:
ПОСПЕХ НАРОДНАГА ФРОНТА НА ВЫБАРАХ ВА ФРАНЦУЗСКІ ПАРЛАМЕНТ.

АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б АД 5 МАЯ 1936 ГОДА

ЦК адзначае, што па стану на 1 мая ход сяўбы па БССР як па якасці, так і па тэмпах, разгортваецца нездавальняюча — адставанне супроць 1935 года на гэта число выражаецца ў 300 тыс. гектараў.

ЦК лічыць, што ў наяўнасці ёсць усе магчымасці ў бліжэйшую дэкаду і не пазней 15 мая не толькі навярстаць адставанне, але і поўнасцю скончыць сяўбу ранніх зернавых, ільну і бульбы. Гэта цалкам і поўнасцю пацвярджаецца фактам сканчэння Бабруйскім раёнам к 1 мая сяўбы гэтых культур і набліжэння да сканчэння сяўбы раёнаў Лепельскай, Слуцкай і Мазырскай акруг.

ЦК лічыць, што пачаты з 2 мая па БССР па ініцыятыве стаханаўцаў-трактарыстаў дэкаднік сяўбы павінен адыграць рашаючую ролю у завяршэнні сяўбы ранніх зернавых, ільну і бульбы да 15 мая.

ЦК указвае партыйна-совецкаму кіраўніцтву Плешчаніцкага, Чырвонапольскага, Мехаўскага і іншых адстаючых па сяўбе раёнаў на слабасць кіраўніцтва з іх боку справай соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскім рухам у раёне і абавязвае іх узяць гэту справу, якая мае велізарнае значэнне ў барацьбе за сталінскі ўраджай, у свае рукі.

ЦК прапануе сакратарам РК, старшыням РВК і дырэктарам МТС і соўгасаў, якія скончылі і заканчваюць сяўбу, пераключыцца на падняцце папараў і праполку азімых.

Абавязаць РК і РВК забяспечыць выкананне плана сяўбы аднаасобнымі гаспадаркамі.

ЦК абавязвае рэспубліканскі і раённы друк разгарнуць шырэй асвятленне ходу дэкадніка і паказ стаханаўскага руху, які разгарнуўся ў МТС і калгасах, выкрываючы ў той-жа час усе факты супраціўлення або роўнадушных адносін да стаханаўскага руху з боку кіраўнікоў МТС і калгасаў.

НА ВЫДАТНА ЗАВЕРШЫМ СЯУБУ

Совецкая Беларусь мае ўсе магчымасці ў бліжэйшыя дні навярстаць адставанне ад мінулага года і да 15 мая поўнасцю закончыць сяўбу ранніх зернавых, ільну і бульбы. Гэта з усёй нагляднасцю паказвае ўвесь ход пасеўнай кампаніі гэтага года, які ідзе пад знакам разгортвання стаханаўскага руху і соцыялістычнага спаборніцтва сярод трактарыстаў і калгаснікаў. Гэта задача пастаўлена ў публікуемым намі сёння рашэнні Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б.

У сёлетнюю вясну ў трактарных брыгадах і на калгасных палях парадавыя людзі-стаханаўцы даюць выдатныя ўзоры высокай прадукцыйнасці працы і высокай якасці работы. Якасць сяўбы стаіць у **цэнтры ўвагі.**

Пад сцягам барацьбы за сталінскі ўраджай выраслі такія выдатныя людзі, як трактарысты **Ахрамовіч, Адзярыха, Аладко, Петручэня, Кандрацэня. Пятровіч, Баброў, Чубукоў, Ячмянёў** і многія іншыя, якія і на ворыве і на сяўбе перакрываюць у некалькі раз існуючыя нормы, даючы высокую якасць работы і эканомію гаручага. Пад сцягам барацьбы за сталінскі ўраджай растуць у калгасах такія людзі, як аратыя **Курыленка, Марозаў**, старшыні калгасаў **Блоцкі, Драгун, Юшчанка** і іншыя, якія паказваюць узоры самаадданай работы і канкрэтнага аператыўнага кіраўніцтва.

Бабруйскі раён першым у БССР закончыў сяўбу зернавых, ільну і бульбы. **Чашніцкі** раён першым у БССР закончыў сяўбу ільну. **Слуцкая** акруга закончыла сяўбу зернавых і ільну. **Лепельская** акруга закончыла сяўбу ільну. **Хойніцкі, Дрыбінскі, Дубровенскі, Капаткевіцкі, Ветрынскі** раёны вышлі таксама ў першыя рады ў барацьбе за сталінскі ўраджай.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваім рашэнні падкрэслівае, што адставанне **Плешчаніцкага, Чырвонапольскага, Мехаўскага** і іншых раёнаў тлумачыцца **перш за ўсё** слабым кіраўніцтвам і дрэннай арганізацыяй справы соцыялістычнага спаборніцтва ў калгасах і трактарных брыгадах.

Соцыялістычнае спаборніцтва і яго вышэйшая форма — стаханаўскі рух — з'явіліся тым магутным вагаром, які забяспечыў перамогу перадавым раёнам і калгасам БССР. І кіраўніцтва ўсіх раёнаў павінна неадкладна зрабіць бальшэвіцкія вывады з гэтага важнейшага ўказання Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б і паставіць у цэнтр сваёй работы клопаты аб жывых людзях, аб лепшых стаханаўцах-трактарыстах, аб перадавых старшынях і брыгадзірах калгасаў, аб лепшых калгасніках—аратых і сейбітах.

Указанне ЦК КП(б)Б аб сяўбе ў аднаасобных гаспадарках мае выключнае значэнне. Райкомы партыі і райвыканкомы павінны неадкладна прыняць канкрэтныя меры да таго, каб забяспечыць выкананне кожнай аднаасобнай гаспадаркай плана сяўбы.

Стаханаўскі дэкаднік МТС адыгрывае рашаючую ролю ў завяршэнні сяўбы. Між тым мы маем факты, калі дырэктары МТС падыйшлі да яго фармальна, бюракратычна, не забяспечваюць канкрэтнага кіраўніцтва, не праяўляюць бальшэвіцкіх клопатаў аб людзях.

Таму ёсць такія агідныя факты, калі ў **Прапойскай** МТС з-за нераспарадчасці дырэктара МТС **Койда** трактар прастаяў 18 дзён, трактарысты не маюць неабходных запасных частак. У **Веткаўскай** МТС трактарысты не забяспечваюцца начлегам. Трактарыст **Калінін** з **Рэчыцкай** МТС ходзіць пасля работы за 7 кіламетраў начаваць дамоў.

Партыя катэгарычна патрабуе ад кожнага кіруючага работніка сапраўдных бальшэвіцкіх клопатаў аб нашых лепшых людзях — стаханаўцах. І тыя дырэктары МТС, якія не клапоцяцца аб паляпшэнні бытавых умоў і культурнага абслугоўвання трактарыстаў-стаханаўцаў, становяцца па сутнасці на шлях прамога сабатажу стаханаўскага руху.

Партыя разграміла сабатажнікаў, якія прабавалі ставіць перашкоды на шляху ўздыму чыгуначнага транспарту. Партыя бязлітасна выкрывае кожнае праяўленне сабатажу ў адносінах стаханаўцаў прамысловасці. Партыя будзе бязлітасна караць тых, хто папрабуе сваімі канцэлярска-бюракратычнымі метадамі работы, адсутнасцю клопатаў аб нашых лепшых людзях, перабоямі ў снабжэнні гаручым і запаснымі часткамі, блытанінай з маршрутамі зрываць і сабатаваць разгортваючыйся ўсё шырэй у сельскай гаспадарцы стаханаўскі рух.

Цэнтральны Камітэт партыі ўказаў, што раёны і МТС, скончыўшыя і заканчваючыя сяўбу, павінны неадкладна пераключацца на ўздым папараў і праполку азімых, як чарговыя звенні неразрыўнага ланцуга мерапрыемстваў, забяспечваючых высокі ўраджай. Мы маем у гэтым годзе ў рэзультаце разгортвання стаханаўскага руху ў трактарных атрадах усе магчымасці, каб узняць папары ў **маі.** Майскія папары — найбольш каштоўныя. Гэта неабходна памятаць.

Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва на калгасных палях і ў трактарных атрадах! Мацней змагацца за высокую якасць сяўбы! Больш клопатаў і бальшэвіцкай дапамогі лепшым людзям — трактарыстам—стаханаўцам і перадавым калгаснікам!

* * *

У ЦК КП(б)Б

На падставе пастановы ЦК ВКП(б) «Аб райкомах партыі ў раённых партыйных арганізацыях з невялікай колькасцю комуністаў» бюро ЦК КП(б)Б вынесла пастанову аб правядзенні ў 41 раёнах партыйных сходаў усіх комуністаў раёна.

На гэтых сходах ЦК рэкамендуе паставіць справаздачу аб рабоце бюро раённага камітэта партыі і выбары раённага камітэта партыі і рэвізійнай камісіі.

Бюро ЦК КП(б)Б указвае райкомам партыі, што рашэнне ЦК ВКП(б) аб ліквідацыі бюро райкомаў у партарганізацыях з невялікай колькасцю комуністаў з'яўляецца важнейшым арганізацыйна-партыйным мерапрыемствам, якое забяспечыць палітычны рост і актывізацыю комуністаў у палітычным жыцці партыі і краіны і будзе спрыяць агульнаму паляпшэнню партыйнай работы.

Бюро ЦК звярнула ўвагу ўсіх райкомаў партыі, дзе будуць праводзіцца выбары райкомаў, што асноўным зместам раённых партыйных сходаў павінна быць разгортванне шырокай крытыкі недахопаў работы райкома і намячэнне канкрэтных мерапрыемстваў, забяспечваючых умацаванне боездольнасці партыйнай арганізацыі, павышэнне ідэйнага і палітычнага ўзроўню комуністаў і паляпшэнне ўсёй сістэмы работы партыйнай арганізацыі.

Устаноўлены для кожнага раёна тэрміны правядзення раённых партыйных сходаў (з 7 па 10 мая).

Для дапамогі ў правядзенні партыйных сходаў бюро ЦК КП(б)Б накіравала ў раёны членаў бюро ЦК і членаў ЦК КП(б)Б.

Стаханаўскі дэкаднік МТС

ДА 15 МАЯ ПОУНАСЦЮ І ВЫСОКАЯКАСНА ЗАВЯРШЫЦЬ СЯУБУ РАННІХ ЗЕРНАВЫХ, ІЛЬНУ І БУЛЬБЫ

ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ НА ПАДНЯЦЦЕ ПАПАРАЎ

МАЗЫР, 5 мая. (Кар. «Звязды»). Тураўская МТС яшчэ 27 красавіка выканала план веснавых палявых работ на 111,7 проц. Веснавое ворыва зроблена на плошчы 1.460 гектараў, дыскаванне — 320 гектараў, баранаванне — 1.741, радковая сяўба праведзена на плошчы 366 гектараў. Заданне на кожны трактар у пераводзе на мяккае ворыва — 94,3 гектара, фактычна-ж выпрацавана 105 гектараў. Трактарысты тт. Рак Сцяпан і Паляніна Надзя на трактары № 17 выпрацавалі ў пераводзе на мяккае ворыва 128,2 гектара, зэканоміўшы 100 кгр. гаручага. На ворыве іх зменная выпрацоўка дасягала 7 гект., а на радковай сяўбе — 17 гектараў. Зараз частка трактараў працуе на падняцці папару і падрыхтоўцы глебы пад грэчку, а частка стаіць на прафілактычным аглядзе з мэтай лепшай падрыхтоўкі да ўборкі і малацьбы новага ўраджаю.

Стаханаўскі дэкаднік трактарысты Тураўскай МТС парашылі адзначыць поўным выкананнем плана падняцця папараў, падрыхтоўкай глебы пад грэчку, а таксама сканчэннем прафілактычнага агляду ўсяго трактарнага парку і сельскагаспадарчых машын. На 5 мая прафілактычны агляд праведзен ужо на 50 проц. 14 трактарыстаў МТС з'яўляюцца стаханаўцамі. Лепшая трактарная брыгада Нікіты Кірылава выканала свой план веснавых работ на 112 проц., зэканоміўшы 420 кгр. гаручага.

ФРАЛОЎ.

Звенні тысячніц за работай

ЛЁЗНА. Узоры барацьбы за высокі ўраджай ільну паказваюць звенні тысячніц. Звяно стаханаўкі ільнаводства т. **Квашчанкі Ульяны,** з калгаса **«Беларуская вёска»,** да першамайскага свята скончыла сяўбу ільну на плошчы 7,5 гектара. На добра апрацаваную глебу высявалася насенне ільну чыстае і пратручанае. На кожны гектар унесена па 2,5 цэнтнера суперфасфату, тры цэнтнеры попелу, тры цэнтнеры сільвініту і цэнтнер курынага памёту. Пры з'яўленні першых усходаў ільну будзе ўнесена на кожны гектар па 0,5 цэнтнера селітры.

Звяно тысячніц т. Глушанковай Марфы, з калгаса «Новы свет», засеяла 6,5 гектара ільну па канюшынішчу. Пад лён унесена 13 цэнтнераў попелу, 12 цэнтнераў курынага памёту. Старанна апрапован і засеян кожны гектар. Звяно арганізавала збор камення і пырніку з поля.

У калгасах «Новы шлях», імя Сталіна, «Рэкорд» і імя Тэльмана з'явіліся дружныя ўсходы ільну. На сцяблах ільну па 3—4 лісткі.

НАПЕРАДЗЕ МАЛАДЗЕЖНАЯ БРЫГАДА

КРУГЛОЕ. 3 мая ў МТС адбылася нарада трактарыстаў-стаханаўцаў. На нарадзе абмяркоўвалі пісьмо тав. **Гікало** да лепшых трактарыстаў. Трактарысты-стаханаўцы абавязаліся да 12 мая завяршыць веснавыя работы.

Наперадзе ідзе маладзёжная комсамольская брыгада **Талохіна.** Трактарысты **Даніленка, Купрыянаў, Мінчукоў** і іншыя перавыконваюць нормы на 150—160 процантаў. Маладзёжная комсамольская брыгада прэміравана.

Але агульны ход веснавых работ трактарнага парку Круглянскай МТС зусім слабы. Машынна-трактарная станцыя знаходзіцца ў вялікім прарыве. План веснавых работ на 30 красавіка выканан толькі на 42,7 проц. Кіраўніцтва МТС супакоілася поспехамі асобных трактарыстаў, слаба разгарнула палітычна-масавую работу па правядзенню стаханаўскага дэкадніка ва ўсіх брыгадах МТС.

МАХАЛОВІЧ.

АВАРЫІ І ПРАСТОІ

ПРАПОЙСК. (**Па тэлефону**). Праведзены зімою рамонт трактараў МТС быў нядобраякасны, што выяўляецца зараз у часе сяўбы. Аварыі і прастоі трактараў набылі масавы характар. У калгасе імя Будзённага. Рагінскага сельсовета, трактары МТС увесь час працуюць з перабоямі. У трактары, на якім працуе трактарыст т. Савіцкі трэснула свяча, з-за адсутнасці запасной трактар прастаяў цэлы дзень.

У калгасе «Сталінскі прызыў», Кужыцкага сельсовета, трактар прастаяў тры дні, бо была папсавана камера. 18 дзён прастаяў трактар у калгасе «Новы шлях», Чарнякоўскага сельсовета з-за нераспарадчасці дырэктара МТС тав. Койда.

Аб бяздзейнасці дырэкцыі МТС сведчыць і наступны факт. Патрэбна было спецыяльнае рашэнне бюро райкома партыі, дзе катэгарычна прапанавана дырэкцыі МТС прапрацаваць пісьмо трактарыстаў Старобінскай і Капыльскай МТС сярод трактарыстаў Прапойскай МТС. Дырэкцыя МТС на працягу цэлага тыдня нічога не зрабіла для распрацоўкі гэтага пісьма. Такім чынам, уключэнне ў стаханаўскі дэкаднік МТС прайшло фармальна.

ЗАЙЦАЎ.

ТАВ. ВАЛКОВІЧ НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ДАСЛЕДЧАЙ СТАНЦЫІ

Учора ўсебеларуская даследчая станцыя механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі паказала новыя сельскагаспадарчыя машыны канструкцыі апошняга года. У рабоце былі паказаны каштоўнейшыя сельскагаспадарчыя машыны (канавакапальнік), кормазапарнік, надземныя дарогі і т. д.). 13 новых машын пушчаны ўжо ў серыйную і масавую вытворчасць.

На праглядзе новых машын прысутнічаў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Валковіч** і нарком земляробства БССР тав. **Бенек.** На праглядзе прысутнічалі таксама маскоўскія інжынеры Ўсесаюзнага інстытута сельскай гаспадаркі тт. **Глаголеў** і **Папоў.**

1 МАЯ 1936 г. У КІЕВЕ

НА ЗДЫМКУ: афармленне аднэй з калон дэманстрантаў — «Чапаеўская тачанка».
Фото ЕЛІЗАВЕТЫ ІГНАТОВІЧ (Саюзфото)

ТРАКТАРЫСТ ТАВ. РАБЦАЎ ЗАБАРАНАВАЎ 123 ГЕКТАРЫ

ТАЛАЧЫН, 5 мая. (**Па тэлефону**). Трактарыст брыгады № 8 Талачынскай МТС т. **Рабцаў Аркадзь** з першых дзён сяўбы на трактары «ХТЗ» выпрацоўваў за 10 гадзін па 8 гектараў. 23 красавіка ён ўзараў 11,2 гектара. 1 мая т. Рабцаў быў прэміраван МТС 150 руб.

3 мая т. Рабцаў за 10 гадзін забаранаваў 123 гектары, што ў пераводзе на мяккае ворыва складае 13,55 гектара.

КІПЕР.

ВЫПРАЦОЎКА ТРАКТАРЫСТАЎ ЧУБУКОВА І ЯЧМЕНЕВА

ХОЦІМСК, 5 мая. (**Па тэлеграфу**). Трактарысты брыгады т. **Чэчыка** — тт. **Чубукоў і Ячменеў**—дабіліся вялікай выпрацоўкі на сваіх трактарах. Тав. Чубукоў узараў за змену 15 гектараў і т. Ячменеў — 15,5. У брыгадзе тав. **Кавалёва** трактарыст **Івандзікаў** выпрацаваў 13,5 гектара, у брыгадзе тав. Лазукова трактарыст т. **Пташкін** — 13,75 гектара.

ШЫЛЯЙКО

РЭКОРД АРАТАГА РУШКОЎСКАГА

ДЗЯРЖЫНСК, 5 мая. (**Па тэлеграфу**). Рабочы-стаханавец соўгаса імя Свердлова т. **Рушкоўскі Іван Антонавіч аднаконным плугам за 10 гадзін работы ўзараў 2,17 гектара.** Рабочы т. **Доўнар Адольф** у гэты-ж дзень узараў 2 гектары. Якасць высокая.

Начальнік палітаддзела соўгаса РУБІНЧЫК.

У ДЭКАДНІК УКЛЮЧЫЛІСЯ ФАРМАЛЬНА

КІРАЎСК, 5 мая. (**Па тэлефону**). Кіраўская МТС у стаханаўскі дэкаднік уключылася фармальна. Сярод трактарыстаў трактарных брыгад, якія знаходзяцца ў калгасах Плешчанскага і Харлапавіцкага сельсоветаў, толькі 4 мая было абмеркавана пытанне аб уключэнні ў дэкаднік. Трэцяга мая большасць трактараў гэтых брыгад зусім не працавала. 4 мая ў калгасе «Пролетарый» трактар прастаяў палову дня з-за адсутнасці гаручага. У калгасах імя Молатава і «Новае жыццё», Капусцінскага сельсовета, 3 і 4 мая трактары сталі ў сувязі з тым, што не была падшукана плошча для іх работы.

Дастаўка снеданняў, абедаў на поле для трактарыстаў і запасных частак для бягучага рамонту на месца работы трактараў не арганізавана. Старшы механік МТС **Адамовіч** зусім не ведае, якое становішча з рамонтным інвентаром у трактарных атрадах. Метады работы лепшых трактарыстаў брыгады т. Ісаенка — Драздоўскага, Ждановіча і Комара, якія выпрацоўваюць па 10 гектараў на трактар у змену, не перанесены ў іншыя брыгады. Прайшло ўжо тры дні стаханаўскай дэкады, але кіраўнікі МТС нават слаба ўяўляюць як праходзіць дэкаднік у брыгадах трактарных атрадаў. Нам. дырэктара па палітчасці т. **Наумава** сама прызнае, што дэкаднік пакуль што не адрозніваецца ад звычайных дзён работы трактарнага парку МТС.

СЯМЕНАЎ.

НА ТРАКТАРЫ У ПРОЦІГАЗЕ

Тав. ПУНЬКО Е.

Гадоў некалькі назад каля соўгаса «Камаровічы» было вялікае балота. Зараз гэтай мясцовасці не пазнаць. Балота асушылі, пусцілі трактары... Ёсць у гэтым соўгасе комсамолец, трактарыст т. **Емельян Пунько.** На сваім «Інтэры» ён паказвае на балотным участку ўзоры стаханаўскай работы, перакрывае ў 3—4 разы норму і эканоміць на кожным гектары каля 50 проц. гаручага.

Емельян Сцяпанавіч Пунько жыве ў прымежным Капаткевіцкім раёне. Ён паставіў перад сабой задачу быць не толькі трактарыстам-стаханаўцам, але і сапраўдным байцом на трактары.

— Я,—гаворыць Пунько,— як толькі выйшаў на поле, пачаў трэніравацца ў процігазе.

Рэгулярна кожны дзень па мінут 15—20, а пасля ўсё больш і больш Емельян Сцяпанавіч працаваў на трактары ў процігазе. Зараз тав. Пунько працуе ў процігазе па 3—5 гадзін кожны дзень. Сваім прыкладам ён уцягнуў у работу ў процігазе яшчэ 8 чалавек.

Емельян Сцяпанавіч паставіў перад сабой задачу працаваць увесь дзень у процігазе, не зніжаючы ні нормы, ні якасці работы.

Ужо з першых дзён работы Пунько пачаў перакрываць норму, эканоміць гаручае. Замест 4,5 гектара па плану ён дыскаваў па 15—18 гектараў. На другі дзень работы Емельян задыскаваў 15,83 гектара, зэканоміў 51 кілограмаў гаручага.

На пятым дні сваёй работы Емельян задыскаваў і прыкатаў 14,35 гектара, зэканоміў 99 кілограмаў гаручага. Такую норму выпрацоўкі і эканомію гаручага ён даў не выпадкова. Каб задыскаваць адзін гектар трэба патраціць 7 кілограмаў гаручага, на прыкатку аднаго гектара трэба 4 кілограмы. Емельян Сцяпанавіч, працуючы па-стаханаўску, скасаваў гэтыя нормы. Замест таго, каб на дыскаванне пускаць адзін трактар, а на пракатку — другі, і разам траціць 11 кілограмаў гаручага, ён дыскаванне і прыкатку робіць адначасова і выдаткоўвае на гектар па 5 кілограмаў гаручага. Ён адначасова дыскуе і да гэтага-ж трактара прычапляе каткі.

Пунько не толькі трактарыст. Ён актыўны селькор: рэдактар брыгаднай насценнай газеты, лепшы завочнік «Крестьянской газеты», комсамольскі арганізатар у соўгасе.

Тав. Пунько з 7 па 21 красавіка зарабіў 628 рублёў. Толькі за эканомію гаручага ён атрымаў 337 рублёў.

Д. МАЛЕВІЧ.

Морскія перагаворы паміж СССР і Вялікабрытаніяй

У сувязі са сканчэннем работ лонданскай морскай канферэнцыі і заключэннем новага морскага пагаднення паміж Вялікабрытаніяй, Злучанымі Штатамі Амерыкі і Францыяй, урад Вялікабрытаніі звярнуўся да ўрада СССР з прапановай уступіць у перагаворы аб заключэнні паміж СССР і Вялікабрытаніяй пагаднення адносна ваеннаморскіх узбраенняў. Прапанова брытанскага ўрада прадугледжвае, апрача ўзаемнага абмену інфармацыяй аб ваенна-морскіх будаўнічых праграмах, у прыватнасці таксама ўстанаўленне вядомых якасных абмежаванняў для нова-будуемых ваенна-морскіх караблёў і ўстанаўленне новай сістэмы класіфікацыі гэтых караблёў па катэгорыях.

⁂

Урад СССР выказаў згоду ўступіць у перагаворы з урадам Вялікабрытаніі аб заключэнні названага пагаднення, аб чым пасол СССР у Вялікабрытаніі тав. Майскі давёў да ведама брытанскага міністра замежных спраў.

Адпаведныя перагаворы пачнуцца ў бліжэйшы час у Лондане.

* * *

Рэзультаты выбараў ва французскі парламент

КОМУНІСТЫ АТРЫМАЛІ 72 МАНДАТЫ

ПАРЫЖ, 5 мая. (БЕЛТА). Міністэрства ўнутраных спраў публікуе наступныя рэзультаты выбараў па ўсіх 618 выбарчых акругах: комуністы атрымалі 72 мандаты супроць 10 мандатаў у 1932 г., соцыялісты 146 супроць 96, соцыялістычны саюз і незалежныя соцыялісты 37 супроць 71, радыкал-соцыялісты — 116 супроць 162 і т. д.

Наогул партыі народнага фронта атрымалі 381 мандат, а астатнія партыі — 237.

⁂

ПАРЫЖ, 5 мая. (БЕЛТА). Друк публікуе заяву намесніка генеральнага сакратара соцыялістычнай партыі **Северэка,** які пацвердзіў, што **соцыялісты гатовы арганізаваць і ўзначаліць урад новай большасці** палаты.

⁂

Як паведамляе друк, народны фронт закліча сваіх прыхільнікаў урачыста адсвяткаваць 10 мая перамогу, атрыманую на парламенцкіх выбарах.

* * *

ВАЙНА Ў АБІСІНІІ

Адыс-Абеба занята італьянскімі войскамі

ЛОНДАН, 5 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр перадае, што, згодна атрыманай міністэрствам замежных спраў радыёграмы англійскага пасланніка ў Адыс-Абебе, сёння на поўдні ў Адыс-Абебу ўступіла вялікая калона італьянскіх войск.

⁂

ЛОНДАН, 4 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр з Адыс-Абебы, за апошнія тры дні толькі адзін італьянскі самалёт лятаў над Адыс-Абебай. Увесь горад разграблены, а цэнтр яго спалены.

Сёння раніцай банда марадзёраў напала на амерыканскую місію, адкрыўшы моцны агонь з вінтовак. Супрацоўнікі місіі адказным агнём адбілі напад.

⁂

ЛОНДАН, 5 мая. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Адыс-Абебы, на тэрыторыі англійскай місіі знайшлі сабе прытулак 2.000 чалавек 23 нацыянальнасцей.

Вуліцы Адыс-Абебы перапоўнены трупамі, якіх пажыраюць сабакі шакалы.

ПАРЫЖ, 5 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас з Джыбуці (французскае Сомалі), туды прыбылі поездам рас Насібу, яго советнік генерал Вехіб паша, рас Маконен і большасць правадыроў Огадэна. Паводле слоў агенцтва, раней яны прабавалі ўцячы ў брытанскае Сомалі, але затым вярнуліся і накіраваліся ў Джыбуці.

⁂

ЛОНДАН, 5 мая. (БЕЛТА). Паводле слоў газеты «Ньюс-кронікл», негус не зможа вярнуць сабе ўплыў у Абісініі, бо супроць яго паўсталі плямёны і ў раёне Харара, і на захадзе і на поўначы Абісініі.

Далей газета ўказвае, што палавінчатая палітыка англійскага ўрада тлумачыцца непадрыхтаванасцю англійскіх узброеных сіл. Міністру замежных спраў Ідэну, — піша газета, — увесь час перашкаджалі перасцярогі, што морскае міністэрства не можа ўзяць на сябе адказнасць, звязаную з цвёрдай пазіцыяй Англіі.

Партыйнае будаўніцтва

АБ ПАСТАНОВАХ ПАРТЫЙНАГА СХОДА

Узровень партыйных сходаў за апошні час значна ўзняўся. Пярвічныя партыйныя арганізацыі, ажыццяўляючы ўказанні тав. **Кагановіча** аб тым, што кожны партыйны сход павінен ідэйна выхоўваць комуніста, праводзяць падрыхтоўку да кожнага партыйнага схода. У абгаварэнні пытанняў, якія стаяць у парадку дня схода, прымае ўсё большая і большая колькасць комуністаў. І натуральна, што прынятыя пастановы партыйных сходаў з'яўляюцца больш поўнымі, больш канкрэтнымі.

Але толькі вынесці рашэнне мала. Галоўнае — яго ажыццяўленне, праверка таго, як гэта рашэнне праводзіцца ў жыццё парткомам, парторгам, кожным комуністам.

На жаль, ёсць яшчэ такія партыйныя арганізацыі, якія не скупяцца на рашэнні, прыняўшы-ж рашэнне, лічаць на гэтым справу закончанай. Пярвічная партарганізацыя полацкага лесазавода (Белдрэў), абгаварваючы на агульным сходзе вынікі праверкі партыйных дакументаў, вынесла пастанову, у якой абавязвае ўсіх комуністаў... «наведваць партыйную школу... узняць сваю актыўнасць... павысіць пільнасць».

На наступным сходзе пры прапрацоўцы пастаноў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) зноў абавязалі ўсіх комуністаў «узняць сваю актыўнасць, павысіць пільнасць і абавязкова наведваць партыйныя заняткі». 27 лютага ў прынятым рашэнні па падрыхтоўцы да абмену партыйных дакументаў зноў паўтараюцца пытанні пільнасці, дысцыплінаванасці і інш., як і ў папярэдніх двух пастановах.

Іменна ў гэтай арганізацыі канкрэтная работа з кожным асобным комуністам падменена рэзалюцыйнай балбатнёй.

У Віцебску на агульным сходзе партыйных груп станкабудаўнічага завода імя Кірава пры абгаварэнні пісьма тав. **Орджанікідзе** комуністы абавязаліся дапамагчы адстаючым рабочым у аўладанні стаханаўскімі метадамі работы. Як выконваюцца гэтыя абавязкі— ніхто не правяраў, а комуністы іх не выконваюць.

Непрадуманае рашэнне партыйнага схода часта прыносіць толькі шкоду. У Чэрвеньскім раёне пярвічная партарганізацыя райвыканкома, рыхтуючыся да абмену партыйных дакументаў, вынесла рашэнне, у якім запэўняе райком партыі, што ў арганізацыі няма такога комуніста, які не заслугоўваў-бы высокага звання члена партыі.

Аднак, пры абмене партыйных дакументаў у гэтай арганізацыі былі выключаны з партыі Трусаў, Мішчык за ўтойванне ад партыі свайго цёмнага мінулага. Вынесшы непрадуманае рашэнне партыйны сход усыпіў пільнасць комуністаў.

Ёсць факты, калі непрадуманае рашэнне прыводзіць да прамога парушэння статута партыі. У Мазыры кандыдацкая група цагельнага завода, якою кіруе комуніст Смірноў, на агульным сходзе выключала з партыі кандыдата партыі Канановіча. За выключэнне Канановіча галасавалі ўсе кандыдаты партыі.

У Веткаўскім раёне, не без ведама райкома партыі, у партарганізацыях РВК, сампрамсаюза пры заслухоўванні індывідуальных справаздач комуністаў выносіліся толькі пастановы аб тым, ці заслугоўвае той ці іншы комуніст насіць высокае званне члена партыі.

Большэвізму чужды самасупакоенасць, рэзалюцыйная балбатня. Партыйныя арганізацыі, якія лёгкадумна адносяцца да вынясення пастаноў, якія не правяраюць выкананне сваіх пастаноў, не аўладалі яшчэ большэвіцкім стылем партыйнай работы.

Неадлучнай часткай праверкі выканання з'яўляюцца справаздачы партыйных камітэтаў, парторгаў перад сваімі арганізацыямі аб выкананні рашэнняў агульных сходаў. Але мала такіх пярвічных арганізацый, дзе партыйны камітэт, парторг сістэматычна рабіў-бы справаздачу перад комуністамі аб выкананні прынятых рашэнняў.

Калі не ведаюць людзей

Да абмену партыйных дакументаў у мазырскай партарганізацыі работа са спачуваючымі была зусім закінута. Пярвічныя партарганізацыі нават не ведалі, колькі ў іх было спачуваючых. Зараз у партыйнай арганізацыі пачалі займацца са спачуваючымі. Калі раней партвучобай былі ахоплены толькі адзінкі, то зараз усе спачуваючыя вучацца ў гуртках палітграматы.

Аднак, мазырскі райком партыі і пярвічныя партарганізацыі да ахопу спачуваючых палітвучобаю падышлі фармальна. Усе спачуваючыя, незалежна ад іх агульнаасветнага і палітузроўню, ахоплены адным гуртком па вывучэнню палітграматы.

У партыйнай арганізацыі лесазавода «Пролетарый» налічваецца 21 чалавек спачуваючых. 10 з іх малапісьменныя, не ўмеюць нават свабодна чытаць і пісаць і зусім не ведаюць арганізацыйных прынцыпаў пабудовы нашай партыі. Між тым, усе яны займаюцца ў гуртку палітграматы па падручніку Інгулава. Дзенісевіч Гаша, якая па складах толькі чытае газету, не ведае статута партыі, таксама вучыцца ў гэтым гуртку. Жаданне вывучаць статут партыі ў яе ёсць. Але ў гэтым ёй не дапамагаюць. Тое-ж самае можна сказаць пра спачуваючых Сакалоўскага, Жыліцкага, Бермана, Мурашка, Загальскага.

Такое-ж становішча з палітвучобай спачуваючых на фанерным заводзе «Чырвоны Кастрычнік» і на мэблевай фабрыцы «Профінтэрн».

У рэзультаце людзі вучацца ў гуртках гадамі і не ведаюць элементарных пытанняў бягучай палітыкі, не ведаюць статута партыі і нават не навучыліся свабодна чытаць і пісаць.

Аказваецца, што сакратар партkома тав. Раднеўскі чакае дырэктывы райкома партыі, каб арганізаваць гурток па вывучэнню статута ВКП(б) для спачуваючых. А загадчык культпропа райкома тав. Мулюк лічыць, што яны вывучалі статут партыі ў мінулым годзе, таму зусім непатрэбна арганізоўваць гурткі зараз. Між тым, у мінулым годзе ў Мазыры са спачуваючымі наогул не працавалі.

Наглядаюцца нават і такія факты, калі ў асобных пярвічных партарганізацыях пры прыёме ў спачуваючыя падыходзілі механічна, без глыбокага папярэдняга вывучэння кожнай кандыдатуры.

Так, на фанерным заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у спачуваючыя прынят Калеснікаў, якога выключылі з партыі пры чыстцы 1929 года за неэтычныя паводзіны. Прабыўшы больш года ў групе спачуваючых, Калеснікаў нікольки не змяніўся. У пярвічнай партарганізацыі лесазавода «Пролетарый» у групе спачуваючых лічыцца загадчык заводскай крамы Белхарчгандля Папер, якога асудзілі за растрату. Пры прыёме Папера ў спачуваючыя партарганізацыя ўзяла за аснову выключна тое, што крама выконвае гандлёвы план.

У апошні час сакратар райкома тав. Левін пачаў знаёміцца са спачуваючымі. Выклікае спачуваючых перыядычна да сябе ў райком па 5—6 чалавек і ў таварыскай гутарцы з імі ўсебакова вывучае іх. Але і ў гэтым добрым пачынанні ёсць адзін істотны недахоп: заключаецца ён у тым, што вывучэнне індывідуальных якасцей кожнага спачуваючага не звязваецца з арганізацыяй практычнай дапамогі і ўздыму тэарэтычнага ўзроўню і ўцягвання спачуваючых у актыўнае палітычнае жыццё.

Р. ФРАЛОЎ.

Арганізацыйная распушчанасць

У парыцкай раённай партыйнай арганізацыі за апошні час асабліва наглядаюцца факты арганізацыйнай распушчанасці, безадказнасці асобных комуністаў.

Комуніст **Дубкоў** з партарганізацыі НКУС, атрымаўшы чарнавік рэгістрацыйнага бланка па абмену партдакументаў, перадрукаваў гэты бланк у некалькіх экземплярах і раздаў комуністам.

Начальніку райміліцыі тав. **Тылінскаму,** як члену райкома КП(б)Б, даручылі расследаваць адну партыйную справу. Тылінскі, не разумеючы ўсёй адказнасці даручэння, перадавер ыў гэту справу свайму беспартыйнаму ўчастковаму інспектару.

Аб безадказнасці гаворыць яшчэ і такі факт. Старшыня спажыўтаварыства комуністка **Мурашка,** будучы аднойчы на сходзе, пакінула сумку, у якой знаходзіўся партыйны білет. Гэту сумку з партбілетам падабраў работнік райкома партыі тав. Кацуба.

Райком партыі асудзіў учынак комуніста Дубкова, але з усіх гэтых фактаў арганізацыйнай распушчанасці не зрабіў належнага палітычнага вываду, не заастрыў увагу ўсёй раённай партарганізацыі.

П. ЧЫКУН.

Дзённік друку

Стаханаўцы ў газеце

На старонках **«Варашылаўца»** (шматтыражка завода імя Варашылава) усё часцей з'яўляюцца матэрыялы стаханаўцаў. Стаханаўцы — асноўны актыў газеты. Гэта зусім натуральна. Рабкор — перадавы чалавек, а на вытворчасці перадавымі людзьмі з'яўляюцца іменна стаханаўцы.

Ініцыятар стаханаўскага руху на заводзе т. **Харнас** стаў пастаянным удзельнікам газеты. Ён пасур'ёзнаму ставіць рад вытворчых пытанняў. 22 сакавіка ў сваім артыкуле ён расказаў аб цікавым вопыце папярэдняй заточкі разцоў. Вопыт т. Харнаса хутка быў падхоплен астатнімі рабочымі. А на галіннай канферэнцыі металапрамысловасці ён знайшоў агульнае адабрэнне. Тав. Харнас адначасова выяўляе і недахопы, якія тармозяць работу. У тым-жа артыкуле ён піша, што па віне інструментальнага цэха зробленыя шаблоны для вымервання траверсаў зроблены не па размеру. Калі-б ён гэта своечасова не выявіў, апрацаваныя дэталі пайшлі-б у брак.

Тав. Харнас чытаў лекцыю ва універсітэце стаханаўца аб сваіх метадах работы на прадольна-стругальным варштаце. Лекцыя прайшла з вялікім поспехам. Пасля гэтага т. Харнас выступіў на старонках «Варашылаўца» з артыкулам «Настала другая маладосць», у якім расказаў аб радасцях жыцця, якія прынесла яму стаханаўская праца.

«Маладосць мая, — піша ён у гэтым артыкуле, — прайшла ў іншых умовах, чым зараз жыве моладзь. Мне не толькі марыць нельга было аб вучобе, а працаваць часта не было дзе. Зараз-жа створаны такія ўмовы, у якіх можна працаваць і вучыцца. Да мяне на дом прыходзяць настаўнікі з інстытута па павышэнню кваліфікацыі гаспадарнікаў, выкладаюць матэматыку, чарцёжную справу, металаапрацоўку, замежныя мовы. Вось і настала мая другая маладосць, я—47-гадовы вучань. І я ганаруся гэтым. Адзнакі ў мяне ў большасці на «добра».

Тав. Харнас упэўнена заяўляе, што стане інжынерам сваёй справы.

У лютым на заводзе было атрымана пісьмо ад фрэзероўшчыка віцебскага завода імя Кірава тав. **Бірунова** з выклікам на спаборніцтва стаханаўца **Шаболтаса.** У гэты час т. Шаболтас быў вылучан інструктарам-наладчыкам. Рэдакцыя «Варашылаўца» склікала нараду стаханаўцаў фрэзероўшчыкаў і стругальшчыкаў завода і абгаварыла пісьмо. Завязалася спаборніцтва. Фрэзероўшчыца **Высеўская** прыняла выклік **Бірукова.** Стругальшчык **Галяшэвіч** выклікаў на спаборніцтва стругальшчыка віцебскага завода імя Кірава т. **Краўзе.** У пісьме да яго т. Галяшэвіч пісаў:

«Апрача вытворчых пытанняў я хацеў-бы ўключыць у наш дагавор пытанні культурнага характару, бо кожны стаханавец павінен быць культурным чалавекам ва ўсіх адносінах. Я чытаю многа тэхнічнай і мастацкай літаратуры. Прачытаў кнігі «Цусима», «Как закалялась сталь», «Человек меняет кожу» і інш. Часта наведваю кіно і тэатры. У будучым годзе думаю паступіць на вучобу ў вышэйшую навучальную ўстанову. Лічу, што і вы ад мяне не адстанеце».

Нумар газеты, у якім было змешчана гэта пісьмо, рэдакцыя паслала ў Віцебск да т. Краўзе. Праз некаторы час т. Краўзе прыслаў адказ. Характэрна, што пісьмо т. Галяшэвіча наштурхнула т. Краўзе на мысль аб неабходнасці сапраўды сур'ёзна заняцца павышэннем свайго культурнага ўзроўню. У прысланым адказе, паведамляючы аб згодзе ўступіць у спаборніцтва, т. Краўзе пісаў:

«Павінен прызнацца, што з чытаннем мастацкай літаратуры ў мяне справа абстаіць горш, але прымаю твой выклік, уключаючы гэта ў пункт соцспаборніцтва. Абавязваюся чытаць кніжкі, наведваць кіно і тэатры».

Зараз шматтыражка перыядычна паведамляе аб выніках спаборніцтва стаханаўцаў двух заводаў.

Загатоўчы цэх вельмі часта тармозіць работу астатніх цэхаў, несвоечасова забяспечваючы іх патрэбнымі і добраякаснымі дэталямі. Цэх на працягу некалькіх месяцаў не выконваў плана. Рэдакцыя «Варашылаўца» арганізавала завочную вытворчую нараду стаханаўцаў-рабкораў гэтага цэха. Адзін за адным стаханаўцы выступалі на старонках шматтыражкі і выкрывалі сур'ёзнейшыя вытворчыя непаладкі, дрэнную арганізацыю працы і нізкую якасць рамонту абсталявання. Адначасова стаханаўцы рашуча ўзяліся за ліквідацыю гэтых недахопаў У рэзультаце работа цэха значна палепшылася. Красавіцкі план цэх перавыканаў.

Стаханаўцы пішуць у шматтыражку не толькі аб сваім вытворчым вопыце, аб тормазах стаханаўскай работы, але і аб сваім радасным, культурным і заможным жыцці. Аб гэтым расказваюць у газеце стаханаўцы **Хаткоўскі, Жаневіч, Кочарава** і дзесяткі іншых. Стаханавец **Дроздзін** у сваім артыкуле напярэдадні Першага мая піша:

«Радасна сустракаю я са сваёй сям'ёй свята 1 мая. Радасна як ніколі, бо «жыць стала лепш, жыць стала весялей».

У маім жыцці не было такога часу, каб я жыў так, як жыву зараз. З'яўляюся стаханаўцам, зарабляю ў дзень па 18—19 рублёў. Кватэра мая да свята адрамантавана, упрыгожана партрэтамі правадыроў, мастацкімі карцінамі. Купіў сабе касцюм, думаю і капялюш купіць. Дзецям справіў новую вопратку. У мяне пяцёра дзяцей. Старэйшы сын працуе вучнем на заводзе, а астатнія ўсе вучацца ў школах. Гляджу на іх і радуюся. Часта думаю, калі гэта было так, каб у рабочага было пяцёра дзяцей і ўсе вучыліся».

Стаханаўцы рабкоры — самыя ганаровыя ўдзельнікі газеты. Задача газеты — яшчэ мацней звязацца з імі больш чула прыслухоўвацца да іх голасу, рашуча змагацца за поўнае і хутчэйшае ажыццяўленне ўзнімаемых імі пытанняў.

Р. ДОДЗІН.
І. ФЕЛЕР.

Перайменаванне Забайкальскай чыгункі ў чыгунку імя Молатава В. М.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР задаволіў хадайніцтва рабочых, служачых чыгункі і працоўных Усходне-Сібірскага края аб перайменаванні Забайкальскай чыгункі ў чыгунку імя тав. Молатава В. М.

У сувязі з пастановай ЦВК Саюза ССР аб перайменаванні Забайкальскай чыгункі народны камісар шляхоў зносін тав. Л. М. Кагановіч выдаў загад, у якім павіншаваў работнікаў дарогі з перайменаваннем і паставіў перад імі рад важнейшых задач.

Прабыванне генеральнага сакратара міністэрства замежных спраў Турцыі ў Маскве

У Маскве ўжо некалькі дзён госціць генеральны сакратар міністэрства замежных спраў Турцыі п. Нуман Менеменджоглу, якому турэцкі ўрад даручыў прымаць удзел у першамайскіх урачыстасцях у Маскве ў якасці прадстаўніка Турэцкай рэспублікі

У дзень прыезду п. Нуман Менеменджоглу 30 красавіка намеснік народнага камісара па замежных справах тав. Н. Н. Крэсцінскі даў у яго гонар снеданне.

1 мая п. Нуман Менеменджоглу прысутнічаў на парадзе на Краснай плошчы.

3 мая п. Нуман Менеменджоглу быў прынят у Наркамаце замежных спраў народным камісарам па замежных справах тав. М. М. Літвінавым і нам. наркома тав. Н. Н. Крэсцінскім.

ПРЫЁМ П. МЕНЕМЕНДЖОГЛУ ТАВ. В. М. МОЛАТАВЫМ

4 мая г. г. старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР тав. В. М. Молатаў прыняў генеральнага сакратара міністэрства замежных спраў Турцыі п. Нуман Менеменджоглу, які знаходзіцца ў Маскве. На прыёме прысутнічалі таксама пасол Турэцкай рэспублікі п. Зекяі Апайдын і намеснік народнага камісара па замежных справах тав. Н. Н. Крэсцінскі.

ПРЫЁМ П. МЕНЕМЕНДЖОГЛУ ТАВ. М. І. КАЛІНІНЫМ

4 мая г. г. старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР тав. М. І. Калінін прыняў генеральнага сакратара міністэрства замежных спраў Турцыі п. Нуман Менеменджоглу, які знаходзіцца ў Маскве. На прыёме прысутнічалі таксама пасол Турэцкай рэспублікі п. Зекяі Апайдын і намеснік народнага камісара па замежных справах тав. Н. Н. Крэсцінскі. (БЕЛТА).

Пахаванне акадэміка І. Г. Александрава

4 мая адбылося пахаванне акад. Івана Гаўрылавіча **Александрава,** памёршага 2 мая пасля доўгай і цяжкай хваробы (саркома). На грамадзянскай паніхідзе выступілі ад Дзяржплана СССР тав. Э. І. Квірынг, ад Акадэміі Навук — акад. Г. М. Кржыжаноўскі, ад НКШЗ — тав. Ю. В. Руды, ад Наркамзема СССР — прэзідэнт Акадэміі сельскагаспадарчых навук А. І. Муралаў і іншыя.

Выступаўшыя адзначалі вялікія навуковыя і інжынерныя заслугі нябожчыка ў галіне планавання народнай гаспадаркі ў складанні першага плана электрыфікацыі і планаў першых двух пяцігодак, а таксама ў справе праектавання буйнейшых гідратэхнічных пабудаванняў СССР, у тым ліку ДнепраГЭС'а, аўтарам праекту якога ён быў.

У 8 гадзін 20 мінут вечара адбылася крэмацыя, на якой з чулівай прамовай выступіў ад імя Наркамцяжпрома акад. Б. Е. **Ведзенееў.**

Ольга Семёнава—чэмпіёнеса СССР па шахматах

ЛЕНІНГРАД, 3 мая. (БЕЛТА). Закончылася дагрыванне нясконччаных партый апошняга туру Усесаюзнага жаночага шахматнага турніру на першынства СССР. У выніку турніру першае месца заняла таленавітая ленінградская шахматыстка Ольга Семёнава, не меўшая за ўвесь турнір ні аднаго паражэння.

Ольга Семёнава — равесніца чэмпіёна СССР гросмайстра Батвініка. Яна радзілася ў 1911 годзе. У шахматы Семёнава пачала іграць з 1930 года. Яе першы буйны поспех — 3-е месца ў першынстве Ленінграда ў 1934 г.

Землі яўрэйскай аўтаномнай вобласці

МАСКВА, 4 мая. (БЕЛТА). Саюзны Наркамзем прызнаў, што плошча асвоенай ворнай зямлі ў яўрэйскай аўтаномнай вобласці можа быць даведзена да 740 тыс. гектараў. Апрача таго, пад сенажаці можа быць скарыстана да 650 тыс. гектараў.

Увядзенне ў сельскагаспадарчы абарот гэтых плошчаў можа быць ажыццёўлена шляхам правядзення паасобных нескладаных меліярацыйных работ. Першая чарга меліярацыйных работ Наркамземам устанаўляецца на плошчы ў 160 тысяч гектараў.

Першы допыт

(УРЫВАК З АПОВЕСЦІ „НОСЬБІТЫ НЯНАВІСЦІ“)

◆

Платон ГАЛАВАЧ

◆

Апрытомнеўшы, Круміньскі ледзь паспеў глянуць на стаяўшых перад ім, як вочы зноў закрыліся, настолькі вялікай была стомленасць. Але яго сілай узнялі і пасадзілі. Тады адчуў боль у правым плячы і ў галаве. Дакрануўся да галавы рукою. Яна была забінтавана. Галаву, як-бы абцугамі сціскалі, так балела. Ён адразу прыпомніў, што з ім было ўвечары, і здагадаўся, што ён у турме. Агледаў камеру, пакуль афіцэр, які быў тут, даваў распараджэнні жандарам. У камеры было цёмна, і ён не разгледзеў, ці ёсць у камеры акно. Бачыў толькі шэрыя, цесна ссунутыя сцены.

Моўчкі ўзняўся з ложка, калі запрапанавалі ісці. У калідоры асляпіла святло. Зажмурыў вочы і доўга ішоў так. Яшчэ больш асляпіла святло ў пакоі, куды прывялі яго. За сталом сядзеў вайсковец з расплікнутым каўняром мундзіра і пагладжваў рукой шыю. Круміньскі зразумеў, што гэта следчы, а яго прывялі на допыт. Усведамленне гэтага ажывіла яго, як-бы адагнала стомленасць, але калі допыт пачаўся, а ён сеў у крэсле перад сталом, стомленасць зноў скавала ўсё цела. Круміньскі аддаўся наплыву думак. Дзіўна, — думаў ён, — як трымаюцца ў паветры жаўранкі, амаль на адным месцы, толькі крыллі ледзь прыкметна дрыжаць...

— Ваша прозвішча і імя?—ставіў пытанні следчы, утаропіўшы ў яго вочы.

Лена сачыла за жаўранкамі, высока закінуўшы галаву і шырока раскрыўшы вочы, ні разу не міргнуўшы імі. Тады вочы ў яе зусім як спелыя вішні, такія цёмныя.

— Нацыянальнасць?

Шапачка ўпала на пясок, так высока яна закінула галаву.

— Кажаце паляк? — Следчы яшчэ больш утаропіў вочы.—Дзе бацькі і хто яны?

А калі ў яе на галаве працёнькая хустка, яна яшчэ цікавей, яшчэ бліжэй тады. Такая як прынесла клунак.

— З кім бачыліся ўдзень, ад самага ранку?

У Дубраўца смешна падстрыжаныя вусы. Бараўскі чават сказаў, што яго па вусах пазнаеш, што комуніст.

— Я цэлы дзень быў дома, адзін.

— Добра. А тых, з кім рабілі сваю справу, таксама не бачылі?

Шаўрук пераскочыў цераз вартавога. Ён бег усміхаючыся, гэта ад таго, што паспелі. А як беглі Бараўскі і Ключынскі не бачыў. Ключынскі кінуўся бегчы, як толькі паспеў выстраліць у вартавога.

— Хто яны?

— Я не разумею, пра каго вы гаворыце.

— Дарэмна прыкідваецеся. З кім вы ўчора былі, мы ведаем і хочам толькі, каб вы сумленна ўсё расказалі, як афіцэр польскай арміі.

Той, што туляўся пазавуголлю, ідучы за намі, вядома шпіён. Ён пачаў сачыць, калі збіраліся да мяне таварышы. Конны раз'езд паехаў пасля яго паведамлення. Яны не ведалі, куды мы ідзем, проста хацелі схапіць нас, западозрыўшы нешта няладнае. Інакш папярэдзілі-б варту па тэлефону.

— Калі ведаеце, навошта-ж пытаць?

— А хто ў вас у горадзе ёсць з самых блізкіх знаёмых?.. жанчына... Хто яна?

Няўжо шпіён прасачыў і за Ленай? Што-ж тады? Яна дзесяць мінут чакала, а шпіён вярнуўся туды. Але-ж ён перш за ўсё павінен быў паведаміць пра нас, а тады ўжо. А на гэта трэба больш дзесяці мінут...

Круміньскі аж заплюшчыў вочы, каб святло не перашкаджала думаць. Трэба было ў момант прадумаць усё.

— У мяне няма ў горадзе блізкай жанчыны.

— Вы дарэмна хаваецеся. Пра вашых таварышоў, — следчы іранічна вымавіў апошняе слова, — мы ўсё ведаем. Яны ўжо далі свае паказанні і расказалі, з кім і дзе вы былі ўчора, перад тым як пайсці... Так... і пра жанчыну. Вам няма чаго таіцца. Нас не дужа і цікавіць скажаце вы пра іх, ці не, мы самі ведаем, што вы былі разам і ведаеце іх, а яны вас. Калі не хочаце адказваць, я не буду пытаць аб гэтым. Вам горш будзе, а не мне. Я меркаваў, паколькі я пачынаю толькі справу, зрабіць як лепш для вас... Так... і для вашых таварышоў...

«Яны ўсе жывыя». Гэта думка прышла ўслед за словамі следчага.

— Вамі цікавіцца сам пан палкоўнік, так... Ён разумее, што вы не па сваёй ахвоце папалі на адраду, а ў парадку іхняй дысцыпліны. Мы хочам ведаць, хто паслаў вас. Вы разумееце, вядома, што пагражае вам, калі будзеце маўчаць. Падумайце аб сваіх словах. Пан палкоўнік зычыць вам дабра і прасіў, але, але, прасіў пачаць справу так, каб даць вам магчымасць апраўдацца. Справа ідзе аб вашым жыцці, а пан палкоўнік гатовы падаць вам руку ратунку...

Следчы пакручваў у пальцах левай рукі аловак, а правай усё расціраў сваю шыю.

Шпіён больш нічога не ведаў, вядома так, ён толькі натрапіў на наш след, як збіраліся, і парашыў прасачыць. А за горад пабаяўся пайсці і паведаміў. Таму і коннікі. А больш нікога не ўзялі, вядома, не.

— Падумайце, — сказаў следчы.

Круміньскі змоўчаў. Цэлам усё з большай сілай авалодвала стомленасць. Следчы крыкнуў. У пакой увайшлі жандары. Круміньскі ўзняўся і пашоў да дзвярэй, у цьмяна асветлены калідор турмы.

— Падумайце, пан падпаручык, над сваім лёсам і маімі словамі, сказаў наўздагон яму следчы. Круміньскі нічога не адказаў і на гэты раз.

У расчыненыя дзверы камеры з калідора ўварвалася святло і Круміньскі здзівіўся свайму ценю. Але святло адпаўзло да дзвярэй і з гэтым цень знік, а каб звыкнуцца з цемрай камеры, Круміньскі заплюшчыў вочы. Стаяў не зыходзячы з месца, пакуль перасталі бразгаць, запіраючы за ім дзверы. Як расплюшчыў вочы, змеціў перад сабою ўгары вузкую паску неба. Акно з кратамі да ўсяго было яшчэ з двара закрыта спецыяльным шчытом з дошак. Паміж шчытом і сцяной угары быў пакінуты невялічкі прасвет, каб зняволены бачыў толькі вузкую паску неба і не мог бачыць вуліцы. Пастаяў пры акне і пашоў да дзвярэй. Не разумеючы навошта, ўпёрся плячыма ў дзверы і пацінуў іх. І самому стала смешна, што зрабіў гэта. Уцякаць не збіраўся, ведаў, што ўсякія спробы зрабіць гэта—бескарысны. Пастаяў і пашоў да ложка, лёг адпачыць.

Ён не памятаў ці даўно лёг. Здаровыя ўчэпістыя рукі сціснулі плечы і ўзнялі з ложка.

— Разаспаўся, як на пярыне ў мамкі.

Вочы бачылі перад сабою жандара і цемру камеры расхінутую ў бакі, да сцен, святлом з калідора. За дзвярыма камеры стаяў другі жандар.

— Пашлі, — сказаў жандар і адышоў крыху ў бок ад ложка.

Яго прывялі ў той-жа пакой, дзе дапытваў следчы. Як адчыніліся дзверы пакоя, па лакіраванаму казырку шапкі, па кароценька падстрыжаных вусах і падстрыжаных вожыкам валасах на круглай галаве пазнаў палкоўніка Шэмета. Палкоўнік стаяў за сталом, злосна пазіраючы насустрач Круміньскаму. А калі жандары зачынілі дзверы і, бразнуўшы шпорамі, сталі за дзвярыма, палкоўнік загаварыў крыклівым голасам:

— Як ты асмельваешся насіць мундзір афіцэра польскай арміі. Ты... хто такі?

Круміньскі прыпомніў палкоўніка, як ён быў на вечарынцы ў старшыні гарадской думы. Прыпомніў ягоныя ўляганні за спявачкай, пахатлівыя позіркі на яе; яго прыглушаны рагатоk і таемнае паведамленне аб прысланых французскіх самалётах. Ён зразумеў злосць палкоўніка, і губы пачала рассоўваць усмешка. Хацелася сказаць: не крычыце, пане палкоўнік, усё роўна мы вас перахітрылі, мы абрэзалі крыллі вашых лятункаў пра паспяховы наступ на фронце і заваяванне большэвіцкіх гарадоў.

— Ты хто такі?—паўтарыў палкоўнік сваё крыклівае пытанне.

— Падпаручык польскай арміі, пане палкоўнік.

— Большэвік, а не падпаручык.

І раптам змяніў тон. Скрануўся з месца, пачаў хадзіць ад сцяны да сцяны, за сталом, адсунуўшы крэсла.

— Гэта ганьба, пане падпаручык. Я не хацеў паверыць у ваш удзел у здрадзе. Не хачу верыць і зараз. Гэта... гэтага нельга, нельга зразумець. Я перакананы, што вы не маглі самі дадумацца да гэтага. Вас уцягнулі, прымусілі, напэўна далі грошай... Але айчызна ўсё здолее даравать, калі вы назавеце іх. І мы заплацім за гэта... а да ўсяго, я гэта на сябе вазьму, павысім вас у чыне.

Круміньскі не здолеў захаваць усмешкі.

— Што? Пан падпаручык! Памятайце, дзе вы!

— Я памятаю.

Палкоўнік спыніўся каля стала і на стол паклаў куртатую далонь сваёй рукі.

— І да ўсяго-ж пан паляк? Пан падпаручык—паляк?

— Так.

— Маўчаць. Пан садзейнічае большэвікам супроць інтарэсаў свайго народу.

Круміньскі стаяў нерухомы і стомлены.

— Няхай пан назаве тых, хто скіраваў яго на шлях здрады і мы ўсё даруем. Ну? Сядзьце і назавіце мне іхныя прозвішчы і дзе яны.

—Палкоўнік сеў, узяў аловак. Але Круміньскі стаяў на месцы. Чаму-ж пан маўчыць? Я ўсё раблю ў інтарэсах пана. Або пан сёння ўсё скажа, або будзе позна...

— Я не разумею чаго пан палкоўнік хоча ад мяне. Раз усе мае таварышы арыштаваны, што-ж яшчэ?

— Я хачу ведаць, дзе ваш партыйны камітэт і хто ў ім?

— Я гэтага не ведаю, пане палкоўнік.

— Пан не хоча сказаць?

— Не ведаю.

— Пан жартуе?

— Не.

— А што, калі нам ужо ўсё вядома?

Круміньскі варухнуў плячыма?

— Тады навошта-ж распытваць мяне?

— Маўчаць. Я даю пяць мінут на развагі. Пан прадумае ўсё і скажа. Камітэт, яго склад і кіраўніка пан ведае... Пяць мінут, а пасля я загадаю гаварыць з панам крыху інакш...

— Мне няма над чым думаць. Пан палкоўнік дарэмна мяне страшыць. Мяне страшылі ўсё жыццё, з самых малых год і білі, і я перастаў баяцца. Мне няма над чым думаць. Я пану палкоўніку нічога не скажу.

— Я ўсё такі даю пяць мінут... Падпаручык. Табе будзе страшна!..

Круміньскі адвёў погляд ад палкоўніка і пачаў углядацца ў карту на сцяне. Ён разумеў, што палкоўнік вядзе з ім гульню, за якою пачнецца сапраўдны допыт, з катаваннямі і здзекамі і па тым, як будуць дапытваць, ён будзе ўгадваць як трымаюцца таварышы.

Палкоўнік паклаў недакураную папіросу на партабак і зірнуў на гадзіннік.

— Ну, пяць мінут прайшло. Ці падпаручык усё яшчэ мае намер займацца жартамі?

Круміньскі здзіўлена варухнуў плячыма. Палкоўнікава гульня надакучыла яму.

— Я нічога не скажу.

— Канчаткова?

— Так.

Палкоўнік узняўся і крыкнуў жандарам.

— Зняць мундзір.

Жандары схапілі Круміньскага за плечы і пачалі расшпіляць гузікі мундзіра.

— Сарваць! — крыкнуў палкоўнік, падышоў і з усёй сілы рвануў мундзір сам. Круміньскі не ўстояў на месцы, а мундзір затрашчэў па швах.

— Сарваць і вон! — крыкнуў палкоўнік. Ён затупаў перад Круміньскім, размахваючы кулакамі. — Я табе зраблю страшна!..

Калі жандары выштурхнулі Круміньскага ў калідор, палкоўнік адчыніў дзверы габінета і крыкнуў наўздагон ім:

— На ніз яго

НЯДОБРАЯКАСНАЯ ПРАДУКЦЫЯ

(ПІСЬМО ЎРАЧА)

Мною, загадчыкам каўчыцкага ўрачэбнага ўчастка, было атрымана ў парыцкай раённай аптэцы 8 аптэчак для распаўсюджвання па калгасах. Але прыходзіцца чырванець, калі распаўсюджваеш гэтыя аптэчкі. У іх няма часткі лякарстваў, якія павінны быць там, згодна прыкладзенага спісу. Частка бутэлечак з-за дрэннай упакоўкі разбіта; вадкасць з іх пралілася на парашкі аспірыну і на соду.

Ці не пара менскаму хімфармзаводу, які выпускае гэтыя аптэчкі, звярнуць увагу на якасць сваёй прадукцыі?

САЛАВЕЙ.

НЕ ПЛАЦІЦЬ АЛІМЕНТАЎ

(ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ)

Мой былы муж Бохан Б. пакінуў мяне з малой дачкой без усякіх сродкаў. Я звярнулася ў магілеўскі нарсуд (бо жыву ў Магілеве), які, разгледзеўшы справу, прысудзіў Бохану выплочваць штомесячна па 60 рублёў.

Гэта было ў лістападзе 1935 года. Зараз ужо мінула амаль палова 1936 года, а Бохан і не думае высылаць грошы.

Я некалькі раз зварачалася да судавыканаўцы і да пракурора Клічаўскага раёна. (Бохан працуе ў гэтым раёне бухгалтарам у саўгасе імя Кірава). Аднак ні той, ні другі мер не прымаюць.

ПУДЗЯНКОВА.

«КУЛЬТУРНІКІ»

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Пры Ратамскім сельсовеце (Менскі раён) існуе клуб, хата-чытальня, бібліятэка. Здавалася-б, што ёсць усе магчымасці разгарнуць культурна-масавую работу. Але не так думаюць культурны работнік Юшкевіч (ён-жа парторг сельсовета) і старшыня сельсовета Бараноўскі.

Узімку мінулага года Бараноўскаму трэба было ацяпліць памяшканне сельсовета. Для гэтай мэты ён садраў фанеру з дэкарацый і сцэны клуба і абабіў ёю сельсовецкі будынак.

З таго часу клуб перастаў працаваць. Юшкевіча гэта нікольк не турбуе. (Зарплата ідзе — чаго-ж больш трэба!).

ГАШЭВІЧ.

КАРОТКІЯ СІГНАЛЫ

ГАЗЕТЫ ПРЫНОСЯЦЬ ПАЧКАМІ

Нясвоечасова дастаўляюць падпісчыкам газеты пісьманосцы кабанаўскага паштовага агенцтва (Жлобінскі раён). Так, пісьманосец Хамянок 7 красавіка разносіў адразу па тры нумары «Праўды» і «Звязды» і па 2 — раённай газеты.

БАРАВІК.

НА ВАДЗЕ І БЕЗ ВАДЫ

На цеплаходзе, які курсіруе паміж Магілевам і Быхавам, вельмі часта няма ні халоднай, ні гарачай вады. У каютах цёмна і брудна. Буфета няма.

ГАРЭЛІК.

БЕЗ ГАСПАДАРА

Будынкі №№ 7 і 11 па вул. Урыцкага (Менск), якія належалі гаспадарчаму аддзелу НКУС, 1 красавіка г. г. былі перададзены жылземкіраўніцтву (начальнік Гальперын), якое па ачыстцы двароў ніякіх мер не прымае, лічачы, што гэтай справай павінен займацца горжылсаюз.

ЗАНІМОНІЦ.

НЯМА ПРАЦЫ Ў ДОМЕ СОЦКУЛЬТУРЫ

Не задавальняе культурных запросаў моладзі крычаўскі дом соцкультуры (загадчык Сцебіхаў). Гурткі пры доме не працуюць. Памяшканне няўтульнае і бруднае. На сценах развешаны пакрытыя пылам непісьменныя лозунгі.

БАРАНАЎ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ „ЗВЯЗДЫ“

«НЕАДКЛАДНА СПЫНІЦЬ БЮРАКРАТЫЧНУЮ ЗАЦЕЮ»

У «Звяздзе» быў змешчан артыкул — **«Неадкладна спыніць бюракратычную зацею».**

Бюро Ельскага РК КП(б)Б прызнала сваёй памылкай, што своечасова не адмяніла шкоднага бюракратычнага каляндарнага задання па сяўбе ранніх культур у раёне.

Складзены каляндарны план для калгасаў, як няправільны, нічога агульнага не маючы з бальшавіцкім кіраўніцтвам веснавой сяўбой, адменен.

Загадчыку райза т. Кімстачу ўказана, што ён павінен разам са спецыялістамі неадкладна практычна дапамагчы, асабліва адстаючым калгасам, па арганізацыі працы і ўздыму ўраджайнасці.

Райза, парторгам, старшыням сельсоветаў прапанавана асаблівую ўвагу звярнуць на якасць сяўбы, апрацоўкі глебы, праверкі якасці сяўбы, поўнае выкананне плана па радковай сяўбе.

БРЫГАДА ОРДЭНАНОСЦА

Вечарам брыгадзір Анюта Караленка вымярае поле. Яна праходзіць з меркай па мяккім ворыве, запісвае апрацаваныя гектары зямлі.

— Ну, колькі я сёння ўзараў, Анюта, — зазіраючы ў паперу, пытае ў яе араты

— А вось зараз пабачым, — падлічвае брыгадзір. — Ты, Міхаіл, узараў 0,83 гектара. Слабавата, толькі ў два разы перавыканаў норму. Глядзі, каб не перагнаў цябе Мікола.

Міхаіл Харкоў запэўняе брыгадзіра, што ў спаборніцтве з Міколам Вегера не застанецца апошнім. Стахановец, як кажа ён, не можа адставаць.

Брыгадзір хлопае аратага па плячу і ідзе далей. Ужо садзіцца сонца, у баразнах туліцца змрок. Анюта спяшаецца вымераць пасеяны ўчастак ільну. Яе чакаюць сейбіты Мірон Шупеня і Міхаіл Раманькоў. Даведаўшыся, што засеяны 4 гектары ільну, яны апошнімі ідуць з поля.

Па дарозе брыгадзір расказвае аб першых гектарах засеянага ільну і ячменю, пасаджанай бульбы.

— А як мяркуеш, Анюта, мы ўправімся першымі скончыць сяўбу, — зварачаецца да яе Мірон. — Сёмая брыгада моцна змагаецца за першынства.

— Яшчэ пабачым хто будзе першым, — не прыпыняючыся, на-хаду гаворыць Анюта Караленка. — Нашы стаханаўцы першынства не здадуць нікому.

У маладым голасе брыгадзіра гучыць рашучасць і цвёрдая ўпэўненасць. Быць наперадзе абавязвае ордэн «Знак почета», якім узнагароджана брыгадзір Анюта Караленка, майстар высокага ўраджаю ільну.

⁂

Брыгада ордэнаносца Анюты Караленка рашыла спаборнічаць з сёмай брыгадай Міці Драздова. Усе калгаснікі другой і сёмай брыгад падпісалі сацыялістычны дагавор.

Спаборніцтва за высокі ўраджай пачалося задоўга да сяўбы. Калгаснікі вывозілі на поле гной, чысцілі насенне, рамантавалі інвентар. Да сяўбы вывезлі ўвесь гной з кароўнікаў, цялятнікаў і канюшань. Сабралі многа попелу. Кожны імкнуўся сабраць найбольш попелу. Адсюль пачалося спаборніцтва паміж усімі калгаснікамі брыгады.

Прыступілі да палявых работ. Галоўным паказальнікам спаборніцтва стала якасць апрацоўкі глебы і сяўбы яравых. Папярэднікі пад лён — угноенае ў мінулым годзе жытнішча. Яно было зазяблена яшчэ ў жніўні. Увосень рассыпалі мінеральнае ўгнаенне. Вясной унеслі па 6 цэнтнераў курынага памёту, 4 цэнтнеры суперфасфату, 2,5 цэнтнера калійнай солі, 20 тон гнойнай жыжы на кожны гектар.

І калі сейбіты Мірон Шупеня і Міхаіл Раманькоў скончылі сеяць лён, старшыня калгаса тав. Вегера, прымаючы поле, сказаў:

— Будзе тут добры, найдабрэйшы лён.

Пад бульбу брыгада вывезла на гектар па 60 тон гною, 4 цэнтнеры курынага памёту, 3,5 цэнтнера калійнай солі і 2,5 цэнтнера суперфасфату. Пасадзілі бульбу ў мяккую глебу па маркеру.

— На кожны гектар, — тлумачыць Анюта Караленка, — пасаджана 40 тысяч бульбін. З-пад кожнага каліва выбярэм не менш 1,4—1,5 кілограма. Так будзе атрымана з гектара 500—600 цэнтнераў бульбы.

⁂

Дошка тэмпаў паказвае ход спаборніцтва паміж брыгадамі калгаса. Наперадзе ідзе брыгада ордэнаносца Анюты Караленка. Яна да 1 мая закончыла сяўбу ранніх яравых.

Стаханаўцы зрабілі брыгаду перадавой. Іх многа. Амаль уся брыгада стала стаханаўскай. Імёны іх ведаюць усе калгаснікі. Вось лепшыя аратыя Міхаіл Харкоў, Нікалай Вегера, Грышка Сергеенка, Грышка Прывалаў, сейбіты Міхаіл Раманькоў і Мірон Шупеня, калгасніцы Марына Кісялёва, Анюта Драздова, Соня Караленка і інш. Кожны дзень яны перавыконваюць нормы ў два і тры разы.

Па стаханаўцах брыгады ордэнаноскі раўняюцца ўсе калгаснікі. Сёмая брыгада Міці Драздова вучылася ў брыгадзіра Анюты Караленка, як апрацоўваць глебу і сеяць яравыя.

Вечарамі пасля работы абменьваліся вопытам работы. Стаханаўцы гаварылі аб сіле спаборніцтва, якое прынесла ім першынства. Анюта Караленка расказала, як яна арганізоўвае спаборніцтва.

— Вось бачыш, таварыш брыгадзір, мы не адсталі, — гавораць Анюце Караленка калгаснікі яе брыгады, — мы гаварылі, што стаханаўцы не павінны адставаць.

Анюта ўсміхаецца, радуецца перамогай сваёй брыгады.

⁂

Часта брыгадзір любіць успомніць пра Маскву, дзе жыве вялікі і мудры чалавек, родны бацька таварыш Сталін. Цёплая бацькоўская ўсмешка правадыра назаўсёды запомнілася Анюце.

— Я дала слова правадыру ўзяць з гектара 10 цэнтнераў ільновалакна. Гэта маё слова будзе выканана.

У мінулым годзе Анюта Караленка — адказная ў калгасе па ільну — дабілася каля 5 цэнтнераў ільновалакна з гектара. Год раней яна працавала звеннявой. Сёлета яна ў калгасе брыгадзір, змагаецца за 10 цэнтнераў ільновалакна з гектара. Анюта марыць яшчэ раз пабываць у Маскве, убачыць роднага Сталіна.

А. ЛОСЬ.

Калгас «Вольная праца», Цэрахаўскі раён.

ІНСПЕКТАР ПА ЯКАСЦІ

Яго чакалі мінут з 15 і не распачыналі нарады. Спазняўся адзін чалавек — брыгадзір другой брыгады Змітрок Рашчынскі. Выціраючы спацелы лоб, ён моўчкі прысеў і позіркам сваіх вачэй якбы запытваў, навошта яго пазвалі ў канцылярыю калгаса. Але тут-жа ўбачыўшы ўсіх брыгадзіраў, інспектара па якасці, старшыню калгаса і лепшых ударнікаў, Змітрок здагадаўся, што справа ідзе аб нечым важным.

Усміхаючыся ў сваю бараду, 60-гадовы калгасны інспектар па якасці Македонскі Аляксандр Васільевіч жартаўліва звярнуўся да Рашчынскага.

— На палях у вас, тав. брыгадзір, горш за ўсіх, і на нараду вы спазняецеся.

— Якасць работы ў вас кульгае на абедзьве нагі.

— Пачакайце, — умешваецца старшыня калгаса тав. Каган, — установім парадак, кожнага выслухаем, падзелімся думкамі, убачым, як у каго ідзе работа і якая якасць.

На вытворчай нарадзе заслухалі ўсе тры брыгады. Тут і выявілася ўсё, як на далоні.

У першай брыгадзе Рашчынскага Карпа велізарнейшы арганізацыйны недахоп. Тут па 6 плугоў ставіцца ў адну баразну, адзін за адным гуськом. Урэшце, спыніўся адзін плугар — спыняюцца і астатнія. Такая расстаноўка людзей зніжае адказнасць за якасць работы, укараняе абязлічку, уносіць ураўнілаўку, затрымлівае якасць і тэмпы работы.

Тут на вытворчай нарадзе сумесна з інспектарам па якасці аднагалосна парашылі, што такая расстаноўка людзей на палях калгаса недапушчальна. Гэта-ж ганьба калгасу. З гэтым і згадзіўся Рашчынскі Карп.

— У другой брыгадзе больш за ўсіх качаюць з якасцю,—заўважвае брыгадзір Акулаў.

Аляксандр Васільевіч слухаў гарачыя спрэчкі і зноў загаварыў.

— У каго больш парушэння агратэхнікі? У другой брыгадзе. Вось замест таго, каб пераворваць зябліва ўпоперак пластоў, вы пераворваеце ўдоўж, ды і плугі не падбіраеце. Ад гэтага ралля ў вас няроўная. Усё поле як-бы ў канавах. За такую работу я буду настойліва прасіць праўленне, каб знізілі налічэнне працадзён. Вы кажаце, што прыдзіраюцца да вас. А вось учора мы з вамі раіліся, што лепш баранаваць дальні ўчастак. А сёння я ўбачыў, што вы баранавалі мокры ўчастак, а сухі сушыце. І яшчэ адно—работу вашых калгаснікаў вы абмяраеце толькі на другі дзень. Куды-ж гэта варта!

Калгас імя Шаранговіча, Ясенскага сельсовета, Асіпавіцкага раёна, змагаецца за сталінскі ўраджай.

НА ЗДЫМКУ: інспектар па якасці калгаснік т. Капчан перадае весткі сельсовету аб ходзе сяўбы ў калгасе.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА

Тут на нарадзе ўстанавілі, што лепш працуе трэцяя брыгада (брыгадзір Акулаў) і горш—другая брыгада (брыгадзір Рашчынскі). Брыгада т. Акулава ў спаборніцтве брыгад калгаса займае першае месца і па тэмпах работы, і па якасці.

На нарадзе ўзнялася спрэчнае пытанне. Брыгадзір першай брыгады заявіў, што заўтра яго брыгада сеяць авёс не можа. Брыгадзір матываваў тым, што глеба яшчэ не прасохла. Гэта пытанне засталося на нарадзе не вырашаным.

На другі дзень, досвіткам, інспектар па якасці т. Македонскі і брыгадзір Карп Рашчынскі аглядвалі поле.

— Ты праў. Трэба пачакаць дзянёк, — заключыў тав. Македонскі.

Да снедання Аляксандр Васільевіч агледзеў работу ўсіх трох брыгад. Сёння працавалі лепш. Аніводнага выпадку парушэння агратэхнікі.

Т. ШАРШНЕЎ.

Калгас імя Куйбышэва, Аршанскага раёна.

У калгасе імя Шаранговіча, Ясенскага сельсовета, Асіпавіцкага раёна, арганізавана 7 дземчанкаўскіх звенняў. Усе звенні спаборнічаюць паміж сабой.

НА ЗДЫМКУ: звяно тав. Юркавец адпраўляецца на работу.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

РЫХТАВАЦЬ ПІСЬМЕННАГА, УСЕБАКОВА ПАДРЫХТАВАНАГА НАСТАЎНІКА

Настаўніцкі інстытут нацыянальных меншасцей існуе другі год. Задача інстытута — падрыхтаваць на працягу двух гадоў выкладчыкаў фізікі, матэматыкі, гісторыі, геаграфіі і літаратуры для няпоўных сярэдніх польскіх, яўрэйскіх і рускіх школ.

Абмежаваны тэрмін навучання ўскладняе падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў-педагогаў. Вучэбная праграма інстытута з'яўляецца ўрэзанай праграмай ВПІ. Так, на ўвесь курс педагогікі адведзена толькі 90 гадзін. Курс псіхалогіі складаецца ўсяго з 30 гадзін.

Слабае веданне нацыянальных моваў некаторымі выкладчыкамі зніжае якасць выкладання асобных дысцыплін. Дырэкцыя не паклапацілася падабраць кадры педагогаў, якія-б усе добра ўладалі мовамі нацменшасцей. Ёсць выпадкі казённых адносін выкладчыкаў да сваіх лекцый. Тав. Малееў чытае курс касмаграфіі. У студэнтаў накапілася шмат незразумелых пытанняў па яго лекцыях, але для растлумачэння іх не было кансультацый.

Большасць студэнтаў інстытута піша непісьменна. Студэнт фізмата тав. **Берковіч** у сваім дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва запісвае пункт, які сведчыць аб яго поўнай непісьменнасці:

— «Ликвидировать «НЗД» на языках и добиться до 1/IV хотя «пасрэдна».

Другі студэнт гэтага аддзялення тав. Плучык піша:

—«Никогда не апаздивать на зарядку».

Асабліва непісьменнымі лічацца гістарычны і фізіка-матэматычны факультэты. Асобныя студэнты, як тт. **Шульман, Шэр** і дзесяткі іншых як на беларускай, так і на яўрэйскай мовах пішуць дрэнна.

Мовы ў інстытуце лічацца пабочнымі дысцыплінамі. Гэта можна бачыць нават з раскладу, дзе яны вызначаюцца апошнімі, пасля ўсіх другіх дысцыплін. Таму і заняткі праходзяць непрадукцыйна.

Культурны ўзровень студэнтаў вельмі нізкі. Гэта-ж факт, што студэнткі літфака **Горская** і **Вечарэбіна** рускіх класікаў Фанвізіна і Гогаля акрэслілі формулай: «Ідэолагі буржуазнай эпохі». Імён лепшых рускіх і совецкіх кампазітараў не ведалі. На пытанне, хто такі Шуберт студэнт **Шэрман** (яўрэйскае аддзяленне) адказаў: «Я яго твораў не чытаў, таму нічога не магу сказаць пра гэтага пісьменніка».

Праца студэнтаў не арганізавана. Замест усідчывай работы над кнігай студэнт «загружан» беганінай» па бібліятэках горада ў пошуках неабходных падручнікаў, бо ў бібліятэцы інстытута іх няма. Нават тыя падручнікі і тая літаратура, што адпускаюцца бібліятэкай для чытальні, не скарыстоўваюцца поўнасцю. У чытальні заўсёды шумна. У інтэрнаце таксама цяжка працаваць, бо ў пакоях жыве па 13 і больш чалавек.

Ад настаўніка совецкай школы патрабуецца палітычная граматнасць. На гэты бок у інстытуце амаль зусім не зварачаюць увагі. З пяці таварышоў розных аддзяленняў аб сутнасці разрыву Германіяй Лакарнскага дагавору змаглі адказаць два. Пра турэцкую ноту аб пралівах ведаў толькі адзін чалавек. Пра сутнасць франка-совецкага дагавору аб узаемадапамозе ніхто не ведаў. Пра апошнія падзеі ў Абісініі ведалі тры чалавекі. Аб Мангольскай Народнай Рэспубліцы здавальняюча ніхто не адказаў.

Прыведзеныя факты грубай непісьменнасці і слабага агульнапалітычнага развіцця студэнтаў гавораць аб нездавальняючай рабоце інстытута па падрыхтоўцы кадраў педагогаў.

Інстытут павінен выхоўваць добрых настаўнікаў. Каб выканаць гэту задачу, трэба перабудаваць работу інстытута, бо пры існуючым становішчы ён не зможа даць кваліфікаваных педагогаў для совецкіх школ нацыянальных меншасцей.

І. КАВАЛЕЎ.

МЯДЗВЕДЖАЯ ПАСЛУГА

З радасцю сустрэлі працоўныя Глускага раёна паведамленне сваёй раённай газеты аб арганізацыі ў газеце літаратурнай старонкі.

«Выходзячая пры нашай газеце літаратурная старонка ставіць сваёй мэтай паказаць творчасць класікаў совецкай літаратуры і пісьменнікаў Беларусі, азнаёміць чытача з іх біяграфіямі і асобнымі мастацкімі творамі пісьменнікаў».

Асабліва радаваліся ініцыятыве газеты маладыя пачынаючыя паэты, якія ёсць у Глускім раёне, бо **«Сцяг калектывізацыі»** дэкляраваў у сваім апавяшчэнні, што выданнем літаратурнай старонкі газета мае на ўвазе:

«выявіць і дапамагчы нашым пачынаючым пісаць таварышам, якія любяць літаратуру, маюць вялікае жаданне вучыцца пісаць і памаленьку пішуць ужо...

...Наша задача — дапамагчы гэтым людзям у літаратурнай рабоце, даць ім магчымасць падняцца да адпаведнага літаратурнага ўзроўню».

Дапамогу пачынаючым пісьменнікам рэдакцыя «Сцяга калектывізацыі» разумее вельмі своеасабліва. Яна бачыць гэту дапамогу толькі ў тым, каб без разбору друкаваць творы пачынаючых, незалежна ад таго, ці маюць гэтыя творы хоць якую-небудзь вартасць. Гэта відаць ужо з першай (і да рэчы апошняй) «літаратурнай старонкі» «Сцяга калектывізацыі» (нумар ад 14 лютага).

«Стаханаўцам»

Звонам металаў
І гулам гудкоў,
Юнацкім запалам
Калонай радкоў.
Праходзяць годы
Тэхнічнай рэканструкцыі,
Узрастаюць тысячы
Новых канструкцый.
Запал юнацкі
У грудзях гарыць
Растуць стаханаўцы,
Жыццё бурліць.
А калі вораг, —
Буржуй, фашыст
Напасці ўздумае, —
Наш чэкіст —
Граніц совецкіх вартаўнік
Пакажа моцны які наш штык.

Навошта было газеце друкаваць гэтыя вершы, пазбаўленыя якой-бы там ні было мастацкай вартасці?

«Літаратурных старонак» глуская газета больш не выдавала. Але вершы пачынаючых паэтаў час-ад-часу газета друкуе. 23 лютага з'яўляецца сырыя, неапрацаваныя верш **Г. Круглова** — «Лесарубы».

Праходзіць доўгі час, і ў нумары за 5 красавіка з'яўляецца верш **Падбярознага** «Вясна». Дазволі прывесці некалькі радкоў з гэтага верша, каб паказаць яго мастацкую вартасць.

«Усё к сяўбе ўжо гатова:
Жывёла скача, коні ржуць,
І сёння дзень вітаюць новы,
У полі трактары пяюць.
На полі разам з трактарамі
Бароны, сеялкі, плугі,
На працу шпарка выязджаюць
Ўзараць зямлю пасля зімы».

Ці не лепш было-б замест таго, каб друкаваць у газеце гэтыя вершы, выклікаць аўтара ў рэдакцыю, ці напісаць яму таварыскае пісьмо, разабраць крытычна яго верш, указаць на недахопы, параіць яму, што чытаць, як вучыцца пісаць. Ці не лепш было-б даваць на старонках газеты агляды творчасці пачынаючых, рэцэнзіі на іх вершы, наладзіць кансультацыю для пачынаючых. Гэта была-б практычная дапамога пачынаючым паэтам.

Друкуючы без разбору, без таварыскай здаровай крытыкі ўсё што паступае ў рэдакцыю, газета аказвае пачынаючым паэтам мядзведжую паслугу.

А. М.

Я. З. Гераўкер

Намеснік загадчыка сельскагаспадарчым аддзелам ЦК КП(б)Б

Аб калгасных хатах-лабараторыях

Сотні і тысячы калгасных хат-лабараторый Украіны за два гады свайго існавання паказалі выдатнейшыя ўзоры работы ў барацьбе за высокі сацыялістычны ўраджай. Гэтыя хаты-лабараторыі акружаны дзесяткамі тысяч калгаснікаў-вопытнікаў, якія вядуць актыўнейшую работу за выкананне лозунга правадыра народаў таварыша **Сталіна** аб штогоднай вытворчасці ў бліжэйшыя 3—4 гады 7—8 мільярдаў пудоў зярна. Імёны многіх з гэтых людзей добра вядомы ўсёй нашай краіне.

Тав. **Постышэў** на ўсеукраінскім злёце загадчыкаў хат-лабараторый сказаў, што іменна праз вучобу ў хатах-лабараторыях вышлі такія вядомыя ўсёй краіне майстры высокіх ураджаяў, як Марыя Дзямчэнка, Ганна Кашэвая, Хрыстына Байдзіч, Марына Гнатэнка, дзесяткі і сотні іншых перадавікоў калгаснага ладу. На Украіне праароблена велізарнейшая работа ў справе арганізацыі калгасных хат-лабараторый і барацьбы гэтых хат за рэкордныя калгасныя ўраджаі. У 1936 годзе калгасы Украіны налічваюць 8.650 хат-лабараторый.

У нас, у БССР, справа з арганізацыяй хат-лабараторый абстаіць, безумоўна, горш чым на Украіне. Мы ў БССР маем усяго ў сучасны момант да 300 хат-лабараторый і то не ўсе з іх працуюць. А ў спаборнічаючай з намі Кіеўскай вобласці яшчэ ў 1935 годзе было больш 1.300 дасканала працуючых калгасных хат-лабараторый.

Але зусім няправільны будуць меркаванні, што ў нас, у БССР, калгасныя хаты-лабараторыі не прывіваюцца да калгаснай вытворчасці. Сама практыка паказвае, што там, дзе пытаннямі арганізацыі калгасных хат-лабараторый займаюцца, дзе ў гэтай галіне працуюць, там ужо хаты-лабараторыі арганізаваны і даюць добрыя рэзультаты работы.

У Пухавіцкім раёне ў сучасны момант ёсць 23 калгасныя хатылабараторыі, у Менскім раёне — 29, у Цэрахоўскім — 18. Гэта па бульбяной зоне рэспублікі. Заслаўскі раён мае 19 хат-лабараторый, Віцебскі — 13, Бешанковіцкі — 10 хат-лабараторый і т. д. Хоць ім яшчэ ў гэтых раёнах і не аддаецца належная ўвага, але ўсё-ж многія хаты ў гэтых раёнах паказалі ўзоры барацьбы за рэкордны сацыялістычны ўраджай.

Вось, напрыклад, хата-лабараторыя калгаса імя Варашылава, Менскага раёна. Загадвае хатай-лабараторыяй калгаснік-вопытнік **Іван Сямёнавіч Шышко.** Гэта хата-лабараторыя працуе над канкрэтным прымяненнем агратэхнікі ва ўмовах свайго калгаса. Яна дабілася станоўчых рэзультатаў і змагаецца ў гэтым годзе за высокі ўраджай.

Хата-лабараторыя калгаса імя Калініна, Пухавіцкага раёна, правядзеннем вопытаў дабілася падвоенага ўдою калгаснага стада і ўкаранення торфу як угнаення ў сваім калгасе. Ведае гэтай хатай калгаснік-вопытнік І. М. Шклярык. Або вось хата-лабараторыя калгаса «Ільіч», Капыльскага раёна. Загадчык хаты-лабараторыі калгаснік-вопытнік **Іван Вікенцьевіч Піліпчык.** Гэта хата-лабараторыя, прымяняючы гноевую жыжу для падкормкі пасеваў, дабілася ў мінулым годзе 700 цэнтнераў з гектара кармовых і 520 цэнтнераў сталовых буракоў.

Хата-лабараторыя імя Чырвонай арміі, Віцебскага раёна, разгарнула работу па закладцы вопытных участкаў пшаніцы, аўса на розных відах угнаенняў. Хата вядзе барацьбу за атрыманне калгасам у гэтым годзе 18 цэнтнераў зернавых з гектара ў сярэднім па калгасу. Ведае гэтай хатай калгаснік-вопытнік **Карп Осіпавіч Пышкін.**

Хата-лабараторыя калгаса «Чырвоная зорка», Дрысенскага раёна, загадчык хатай-лабараторыяй калгаснік-вопытнік Лазар Савельевіч Шачкін. Гэта хата-лабараторыя ўжо ў 1935 годзе правяла рад важнейшых работ, напрыклад, вывучэнне патрэбнасці асушанага балота ва ўгнаеннях і інш.

Наша рэспубліка мае рад калгасных хат-лабараторый, якія даюць добрыя рэзультаты работы. Праўда, такіх калгасных хат-лабараторый у нас яшчэ не зусім многа, але іх будзе больш, калі мы аддамо гэтай справе неабходную бальшавіцкую ўвагу.

Трэба прызнаць, што ў нас, у БССР, не ўсюды бальшавіцкую ўвагу аддаюць пытанню арганізацыі хат-лабараторый. Ва многіх раёнах справай стварэння і арганізацыі работы калгасных хат-лабараторый зусім не займаюцца і не працуюць над стварэннем гэтых культурных ачагоў — калгасных хат-лабараторый. Такі вялікі сельскагаспадарчы раён, як Орша, мае адну толькі калгасную хату-лабараторыю ў калгасе «Авангард». Але нават гэтай адной хатай-лабараторыяй мала хто ў раёне цікавіцца.

Такіх раёнаў, як Орша, дзе ёсць толькі адна калгасная хата-лабараторыя, яшчэ нямала. Такое становішча мы маем і ў **Клімавіцкім, Гарадоцкім, Жлобінскім, Рагачоўскім, Рэчыцкім, Ельскім, Глускім, Веткаўскім** і **Чырвонапольскім** раёнах.

У дагаворы на спаборніцтва паміж БССР і Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі, БССР узяла на сябе абавязацельства — арганізаваць у 1936 годзе 500 новых калгасных хат-лабараторый. Гэты пункт дагавору выконваецца вельмі дрэнна.

Па ільнаводчай зоне не маюць ні адной калгаснай хаты-лабараторыі **Чавускі, Мсціслаўскі, Полацкі, Чашніцкі, Дрысенскі, Талачынскі, Суражскі, Сіроцінскі, Ветрынскі, Багушэўскі, Круглянскі і Асвейскі** раёны. І гэта справа нікога ў гэтых раёнах не трывожыць.

Па зернавой зоне не маюць ні адной хаты-лабараторыі **Мазырскі, Лагойскі, Бягомльскі, Камарынскі, Уздзенскі, Тураўскі, Капаткевіцкі** і **Даманавіцкі** раёны. І, нарэшце, бульбяная зона, у якой не маюць ні адной хаты-лабараторыі **Чэрыкаўскі, Бялыніцкі, Буда-Кашалеўскі, Бярэзінскі, Добрушскі, Клічаўскі і Уваравіцкі** раёны.

Занальныя кіраўніцтвы Наркамзема БССР не займаюцца як след справай арганізацыі работы калгасных хат-лабараторый. Аб гэтым сведчыць той факт, што, напрыклад, у ільняной зоне ў 32 раёнах ёсць толькі 65 калгасных хат-лабараторый. У зернавой зоне (28 раёнаў) ёсць толькі 80 калгасных хат-лабараторый і, нарэшце, у бульбяной зоне (30 раёнаў) ёсць толькі 118 хат-лабараторый.

Выключную ролю павінны былі адыграць у справе арганізацыі хат-лабараторый навуковыя і навукова-даследчыя сельскагаспадарчыя ўстановы. Між тым, гэтага ў нас яшчэ няма. У нас да гэтага часу навуковыя і навукова-даследчыя ўстановы сельскай гаспадаркі не займаюцца па-сапраўднаму калгаснымі хатамі-лабараторыямі, дрэнна яшчэ дапамагаюць ім у рабоце.

Зусім недапушчальным з'яўляецца таксама і той факт, што ва многіх мясцах спецыялісты райза і МТС не аказваюць належнай дапамогі хатам-лабараторыям у іх рабоце.

Загадчык калгаснай хатай-лабараторыяй калгаса імя Варашылава, Менскага раёна, Іван Сямёнавіч Шышко аб прымацаваным да хаты-лабараторыі аграноме гаворыць: «прымацован участковы аграном тав. Стаскевіч, але пажадана, каб прымацавалі лепшага». І тав. Шышко зусім праў. Стаскевіч не дапамагае тав. Шышко ў яго рабоце па хаце-лабараторыі. Такіх фактаў у нас яшчэ вельмі многа, дзе прымацаваныя спецыялісты да хат-лабараторый безадказна адносяцца да сваіх абавязкаў.

Зусім правільна пішуць загадчыкі хат-лабараторый у пісьме, апублікаваным у «Звяздзе», аб тым, што цяпер хаты-лабараторыі з'яўляюцца неадлучнай часткай калгаснай вытворчасці і зусім правільна заклікаюць да таго, каб у кожным раёне арганізаваць у 1936 годзе 10—15 новых хат-лабараторый у больш буйных калгасах.

Наркамзему, райземаддзелам, МТС, спецыялістам сельскай гаспадаркі, навуковым, навукова-даследчым установам трэба як належыць узяцца за справу арганізацыі калгасных хат-лабараторый.

Занальным кіраўніцтвам Наркамзема трэба разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж сабою на лепшую арганізацыю хат-лабараторый, кіраўніцтва імі і лепшую ўсебаковую дапамогу ім у рабоце.

Навуковым і навукова-даследчым установам, гандлюючым арганізацыям і спецыялістам сельскай гаспадаркі трэба больш чула адгукнуцца на пісьмо загадчыкаў хат-лабараторый, разгарнуць паміж сабою сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую дапамогу ў рабоце калгасным хатам-лабараторыям.

Райкомам КП(б)Б трэба ўзначаліць і арганізаваць работу хат-лабараторый, трэба, каб сапраўды кожны раён у 1936 годзе арганізаваў 10—15 новых калгасных хат-лабараторый.

Справа гонару кожнага раёна, МТС, калгаса быць у першых радах барацьбы за арганізацыю ў БССР у 1936 годзе 500 новых калгасных хат-лабараторый і тым самым выканаць адзін з важнейшых пунктаў дагавору па спаборніцтву БССР з Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі.

Акруговы тэатр Чырвонай арміі Беларускай ваеннай акругі ў Менску

ТЭАТР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Акруговы тэатр Чырвонай арміі Беларускай ваеннай акругі існуе тры гады. За гэты час тэатр стаў шырока вядомым камандзірам і байцам акругі. З'яўляючыся маладым, яшчэ не ўмацаваўшымся творчым арганізмам, тэатр правёў велізарную работу ў часцях акругі як па лініі мастацкага абслугоўвання, так і па лініі развіцця чырвонаармейскай самадзейнасці. Камандаванне і паліткіраўніцтва Беларускай ваеннай акругі, асобных часцей акругі некалькі раз адзначалі ў сваіх загадах вялікую работу тэатра, кіраўніцтва і асобных работнікаў, абвяшчалі падзяку і прэміравалі.

Тэатр у даны момант мае ў сваім складзе такіх высокакваліфікаваных майстроў, як Н. Е. Аблоў, П. А. Кашэўскі, В. І. Ліхачоў, А. Г. Паселянін, Н. М. Грыгор'еў, І. З. Шэр, Ю. Г. Розанаў, А. Д. Байко, Т. Г. Мухіна, Н. І. Багданава, М. Л. Лапо-Данілеўская, М. М. Сібінская, Н. С. Гальская і іншыя. Маладыя сілы тэатра — гэта байцы, якія прышлі ў РСЧА з тэатральных вышэйшых навучальных устаноў, буйных тэатраў сталіц і абласных гарадоў. Ужо ў бягучым годзе тэатр змог ажыццявіць пастаноўкі «Смерть И. Грозного», «На дне», «Господа офицеры», «Слава», «Далекое».

У 1937 годзе тэатр атрымлівае найлепшае памяшканне пры Доме Чырвонай арміі ў Менску. 1936 год і пачатак 1937 года ў жыцці тэатра трэба разглядаць як адказнейшы арганізацыйны перыяд, як перыяд падрыхтоўкі да прыезду ў Менск. У гэты перыяд росту і ўмацавання на творчых пазіцыях перад кіраўніцтвам тэатра стаіць задача канчатковага ўкамплектавання калектыва, замацавання работнікаў. Склад тэатра будзе павялічан, будуць запрошаны буйныя майстры.

Штодзенныя клопаты, непасрэднае кіраўніцтва тэатрам з боку паліткіраўніцтва Беларускай ваеннай акругі, рэальная дапамога з боку Наркомасветы БССР, чулыя адносіны да тэатра з боку грамадскасці забяспечваюць яму ўсе магчымасці для таго, каб стаць у рад вядучых тэатральных арганізмаў.

У Менску тэатр на сцэне Польскага дзяржаўнага тэатра, на сцэнах Дома Чырвонай арміі і клубаў часцей пакажа свае работы: «Далёкое» А. Афінагенава і «Слава» В. Гусева (у пастаноўцы мастацкага кіраўніка Н. Г. Гнедзіча), «Смерть И. Грозного» А. Талстога і «Платон Кречет» А. Карнейчука (у пастаноўцы рэжысера А. Г. Паселяніна). Пасля гастроляў у Менску тэатр выязджае ў чарговую паездку па акрузе для работы ў часцях.

Н. Г. ГНЕДЗІЧ.

Мастацкі кіраўнік акруговага тэатра Чырвонай арміі БВА.

АРТЫСТЫ АБ САБЕ І СВАЕЙ РАБОЦЕ

(З гутаркі з работнікамі тэатра).

А. Г. ПАСЕЛЯНІН

У часе грамадзянскай вайны я быў у адной з чырвонаармейскіх часцей начальнікам тэатральнай каманды. Гэта назва на сёнешні дзень здаецца смешнай, але ў той час яна не выклікала смеху. Наша чырвонаармейская акторская «каманда» давала час ад часу невялічкія пастаноўкі.

Расла культура ў Чырвонай арміі, раслі і патрабаванні да мастацтва. Нават самадзейнае мастацтва, невялічкія тэатральныя чырвонаармейскія гурткі стаяць значна вышэй ад былых «тэатральных каманд».

Мяне зараз радуе, што Чырвоная армія вырасціла нямала дасканалых, высокамастацкіх тэатральных калектываў, якім ёсць што паказаць, ёсць чым ганарыцца. Ад невялічкіх самадзейных калектываў мы дараслі да буйных тэатраў. Я ганаруся тым, што працую ў адным з такіх тэатраў, перад якім ляжаць невычарпальныя творчыя магчымасці.

Н. М. ГРЫГОР'ЕЎ

Дванцаць год працую ў тэатры. Пераважная палова гэтага часу прыпадае на работу ў арміі. З 1917 па 1926 год я быў у Чырвонай арміі як баец і як актор. У 1926 годзе дэмабілізаваўся і да 1934 года працаваў у тэатрах Масквы (тэатр Ленсовета, Цэнтральны тэатр Юнага глядача і інш.), Краснадара, Казані. Але зноў цягнула ў армію, да так блізкага і знаёмага мне глядача-чырвонаармейца. І я іду ў тэатр Чырвонай арміі Беларускай ваеннай акругі.

Наш глядач даў мне невычарпальную крыніцу творчага запалу і энтузіязму. У радзе пастановак я іграю адказныя ролі. І кожны раз, чым цяжэйшая, чым адказнейшая ў мяне роля, тым больш у мяне радасці і задавалення, што я нясу мастацтва ў рады абаронцаў нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.



Будынак новаадбудаванага дзіцячага кінотэатра ў Менску.

Фото КУРСЕВІЧА

ГЛЯДАЧЫ АБ ТЭАТРЫ І ЯГО ПАСТАНОЎКАХ

ВІТАЕМ ПРЫЕЗД ТЭАТРА

П'еса Афінагенава «Далёкае» заражае глядача бадзёрасцю, дае яму вялікую зарадку. Асноўны герой п'есы — камандзір корпуса — рэальны, выдатны вобраз вышэйшага чырвонага камандзіра, валявога і жыццерадаснага — пакідае ў глядача незабыўнае ўражанне. Папаўшы на закінуты далёкі чыгуначны раз'езд, ён здолеў за кароткі тэрмін пераламаць настроі людзей, даказаць ім, што ў нашай цвітучай краіне геразім можна праявіць на любым участку работы — няхай гэта будзе нават у самым аддаленым кутку. Вера ў жыццё, у перамогу соцыялізма — вось асноўны сэнс п'есы.

Тэатр Беларускай ваеннай акругі ставіць спектакль вельмі добра. Асабліва трэба адзначыць добрую ігру артыстаў, якія выконваюць ролі камандзіра корпуса, стрэлачніка — сектанта і дачкі начальніка раз'езда.

Мы вітаем прыезд тэатра ў Менск і лічым, што яго пастаноўкі і ў першую чаргу п'есу «Далёкае» павінны ўбачыць шырокія масы байцоў, камандзіраў і палітработнікаў.

Палкоўнік Э. Б. ГРОС.

АРГАНІЗУЕМ ПРАГЛЯДЫ ПАСТАНОВАК

У тэатры Беларускай ваеннай акругі я глядзеў спектакль «Далёкае» У пастаноўцы вельмі ярка паказана любоў працоўных да сваёй роднай Чырвонай арміі. П'еса паказвае геразічныя справы ў будзённым жыцці далёкага раз'езда. Мне запомніліся вобразы радыста, камкора і начальніка станцыі ў добрым выкананні артыстаў.

Мы зараз арганізуем прагляды пастановак тэатра партыйным, комсамольскім актывам і стаханаўцамі фабрыкі. Ад імя рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрыкі жадаю калектыву тэатра далейшых творчых поспехаў.

І. ГЕФЕН.

Сакратар парткома абутковай фабрыкі імя Кагановіча.

П'ЕСА ХВАЛЮЕ

Я глядзеў п'есу «Далёкае» з вялікім задаваленнем. Ужо самы пачатак — радасная сустрэча камандзіра корпуса з невялічкім калектывам чыгуначнікаў закінутага раз'езда «Далёкае» хвалюе і радуе. Гэта — яркая рыса, якая характарызуе бязмежную любоў працоўных нашай краіны да рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, да яе байцоў і камандзіраў.

Чыгуначнікі рапартуюць камандзіру корпуса аб сваіх дасягненнях, не без гонару паказваюць яму сваю гаспадарку. Яны вельмі скромныя, але ў кожнага тоіцца думка: «Я жыву ў захалусці, на далёкім невядомым раз'ездзе, а там, у вялікіх гарадах, у цэнтры можна па-сапраўднаму праявіць сябе, стаць героем». Камкор пераканаўча даказвае, што іх работа і ёсць геразім, што яны будуюць соцыялізм разам з усёй краінай. П'еса хвалюе сваёй праўдзівасцю.

Капітан М. Д. ДЭМУРА.

ЯШЧЭ ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ І ВУЧЫЦЦА

Нам вельмі спадабалася п'еса «Далёкае», якая ставіцца ў тэатры БВА. Асабліва добрае ўражанне робіць камандзір корпуса. Ён паказвае, якім павінен быць кожны камандзір, кожны баец нашай Чырвонай арміі. Яго жыццё — гэта слаўны шлях барацьбы за шчаслівую, радасную будучыню чалавецтва.

Калі глядзіш п'есу, заражаешся бадзёрасцю, жаданнем працаваць і вучыцца яшчэ лепш. Вобраз камандзіра корпуса выклікае ў кожнага глядача жаданне быць такім-жа, як ён.

Чырвонаармейцы Н-скай часці
А. К. ЛОЦМАНАЎ, І. Л. БОГДАН.

АДКРЫЦЦЁ ДЗІЦЯЧАГА ГУКАВОГА КІНО-ТЭАТРА У МЕНСКУ

У прасторнае фае, сярод якога б'юць крышталныя струмені фантана, у такія-ж прасторныя і светлыя чытальню і залу для гульняў учора першы раз прышлі са сваімі бацькамі дзеці. Яны тут поўныя гаспадары, тут усё для іх.

— Дзякуй роднаму Сталіну за добрае і шчаслівае дзяцінства, — напісана на вялікім чырвоным палотнішчы.

Вечар, прысвечаны адкрыццю менскага дзіцячага гукавога кінотэатра, адкрыў дырэктар Белдзяржкіно тав. Галкін.

З прывітаннем ад менскага гарадскога камітэта партыі выступіла тав. Чыжова.

Пасля ўрачыстай часткі быў паказан гукавы фільм «Шчаслівая змена».

Дзеці Менска атрымалі добры кінотэатр.

ПЯТНАЦЦАЦІГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ ДЗІЦЯЧАГА ДОМА ІМЯ ЛЕКЕРТА

Споўнілася 15 год выдатнай работы яўрэйскага дзіцячага дома імя Лекерта ў Магілеве. Адзначаючы гэты юбілей, прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанавіў узнагарадзіць граматай ЦВК БССР загадчыцу дзіцячага дома тав. **Ізраільскую** Соф'ю Іосіфаўну.

На абсталяванне дзіцячага дома асігнуецца 10.000 рублёў. Адначасова прэзідыум ЦВК БССР прапанаваў Наркомасветы і магілеўскаму РВК выдзеліць са сваіх бюджэтаў сродкі на паляпшэнне дабрабыту дзіцячага дома і прэміраванне лепшых работнікаў.

ЯЎРЭЙСКАЯ ЛІНГВІСТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў БІРАБІДЖАНЕ

У маі ў Бірабіджане склікаецца яўрэйская навуковая лінгвістычная канферэнцыя з удзелам вучоных лінгвістаў Масквы, Ленінграда, УССР, і БССР. З БССР на канферэнцыю едзе дэлегацыя ў складзе доктара гістарычных навук праф. Агурскага, прафесара літаратуры Браништэйна і яўрэйскага паэта Харыка. Беларуская Акадэмія Навук падрыхтоўвае пасылку ў Бірабіджан для пастаяннай работы групы яўрэйскіх навуковых работнікаў-мовазнаўцаў і эканамістаў.

СЯМ'Я КАЛГАСНІКА КЛОПАВА ЗА ВУЧОБАЙ

МАГІЛЕЎ. Калгаснік Спяпан Клопаў з калгаса «Ударнік», Мохаўскага сельсовета, сам вучыцца ў 5 класе вячэрняй школы, мае па вучобе добрыя адзнакі. Вечарам ён многа чытае агратэхнічнай літаратуры. 13-гадовы сын Іван вучыцца ў 4 класе, 11-гадовая дачка Наста — у 3 класе, 9-гадовы сын Федзя — у другім класе і 8-гадовы Валенцін — у першым. Усе яны добра займаюцца.

— Мае дзеці, — гаворыць Клопаў, — абавязкова будуць інжынерамі і аграномамі. Сваю жонку, малапісьменную, сёлета абавязкова накірую ў вячэрнюю школу. Праз год-два ў маёй сям'і ўсе будуць добра граматнымі.

Г. ПАЎЛАЎ.

АЎТААГІТФУРГОН НА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ

РЭЧЫЦА. Раённыя камітэты партыі і комсамола для культурнага абслугоўвання калгаснікаў у часе веснавой сяўбы арганізавалі аўтаагітфургон. У склад агітбрыгады ўваходзяць інструктар фізкультуры, фатограф, цырульнік і т. д. Аўтаагітфургон выехаў у калгасы.

С. ФІЛОНЧЫК.
В. КОРБУТ.

ЗАГАД

НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА АСВЕТЫ БССР

5 мая 1936 г. № 269 г. Менск.

АБ ПАРАДКУ ПРАВЯДЗЕННЯ Ў ЖЫЦЦЁ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК СССР «АБ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ЗВАННЯХ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ І СЯРЭДНІХ ШКОЛ» І ПАСТАНОВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) «АБ ПАРАДКУ ЎВЯДЗЕННЯ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ЗВАННЯЎ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ І ПРЫЗНАЧЭННІ НАСТАЎНІКАЎ, ЗАГАДЧЫКАЎ І ДЫРЭКТАРАЎ ШКОЛ» АД 10 КРАСАВІКА Г.Г.

На падставе пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР «Аб персанальных званнях для настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ» ад 10 красавіка 1936 г. і пастановы Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Аб парадку ўвядзення персанальных званняў для настаўнікаў і прызначэнні настаўнікаў, загадчыкаў і дырэктараў школ» ад 10 красавіка г.г., **загадваю:**

1. Правесці атэстацыю на званне настаўніка пачатковай школы і на званне настаўніка сярэдняй школы ўсіх асоб, якія зараз працуюць настаўнікамі ў пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах.

2. Для правядзення атэстацыі настаўнікаў, якія зараз працуюць у пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах, для атрымання імі звання настаўніка пачатковай школы і настаўніка сярэдняй школы, арганізаваць пры Народным камісарыяце асветы БССР пяць спецыяльных атэстацыйных камісій у наступным складзе:

а) Першая атэстацыйная камісія: т. Кузняцова — заг. менскага гарАНА (старшыня атэстацыйнай камісіі), т. Кравякоў — дырэктар 1-й менскай школы (чл. камісіі), т. Маеўскі — настаўнік 36 сярэдняй школы Менска (чл. камісіі).

б) Другая атэстацыйная камісія: т. Башкевіч — нач. кіраўніцтва вышэйшай школы НКАсветы БССР (старшыня камісіі), т. Лісейчыкаў — заг. полацкага акруговага аддзела народнай асветы (чл. камісіі), т. Тіцанаў — дырэктар 22 віцебскай сярэдняй школы (чл. камісіі).

в) Трэцяя атэстацыйная камісія: т. Грыневіч — дыр. Навукова-даследчага інстытута школьнай педагогікі (старшыня атэстацыйнай камісіі), т. Рамановіч — заг. мазырскага окрАНА (чл. камісіі), т. Прудьнікава — настаўніца гомельскай школы імя Комінтэрна (чл. камісіі).

г) Чацвертая атэстацыйная камісія: т. Панкевіч — акадэмік (старшыня атэстацыйнай камісіі), тав. Кроль — заг. лепельскага окрАНА (чл. камісіі), т. Прэабражэнская — настаўніца 1-й магілеўскай сярэдняй школы (чл. камісіі).

д) Пятая атэстацыйная камісія: т. Ерафееў — нач. кіраўніцтва пачатковай школы (старшыня атэстацыйнай камісіі), т. Беразоўскі — заг. слуцкага окрАНА (чл. камісіі), т. Раманчук — дыр. 1-й слуцкай школы (чл. камісіі).

3. Зацвердзіць размеркаванне гарадоў і раёнаў БССР паміж атэстацыйнымі камісіямі (гл. дадатак).

4. Атэстацыйным камісіям весці ўсю работу ў строгай адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР «Аб персанальных званнях для настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ» ад 10 красавіка 1936 г. і пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб парадку ўвядзення персанальных званняў для настаўнікаў і прызначэнні настаўнікаў, загадчыкаў і дырэктароў школ» ад 10 красавіка 1936 г., кіруючыся наступным:

а) Атэстацыю ўсіх настаўнікаў пачатковай, няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школы скончыць да 1 жніўня 1938 г.

б) У першую чаргу да 1 снежня 1936 г. правесці атэстацыю тых настаўнікаў, у адносінах якіх ёсць весткі аб іх непадрыхтаванасці да педагагічнай работы або якія не маюць належных дакументаў аб сканчэнні адпаведных педагагічных ці прыроўненых да іх навучальных устаноў (педагагічныя інстытуты, настаўніцкія інстытуты, педагагічныя тэхнікумы, былыя настаўніцкія семінарыі і інстытуты, 8-я дадатковыя класы былых жаночых гімназій і т. д.).

У адносінах кожнага настаўніка з гэтай групы атэстацыйная камісія павінна, апрача ўстанаўлення магчымасці прысваення звання настаўніка, таксама ўстанавіць, — у выпадку адмоўнага заключэння камісіі аб прысваенні звання, — ці падлягае настаўнік, які праходзіць атэстацыйную камісію, аслабаненню ад педагагічнай работы з прычыны непрыгоднасці да яе, або можа быць часова дапушчаны да выканання абавязкаў настаўніка пачатковай, няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школы з тым каб не пазней 1 жніўня 1938 года ім былі зданы ўстаноўленыя іспыты для атрымання адпаведнага персанальнага звання настаўніка.

в) Настаўнікаў, якія не маюць адпаведнай закончанай асветы (агульнай ці педагагічнай), але якія маюць у поўнай меры дастатковую падрыхтоўку для вядзення выкладчыцкай работы і прапрацавалі паспяхова ў школе ў якасці настаўніка не менш 5 год, атэстацыйныя камісіі могуць прадстаўляць для прысваення ім адпаведнага звання настаўніка.

г) Апрача праверкі дакументаў аб сканчэнні педагагічных навучальных устаноў і прыроўненых да іх іншых навучальных устаноў, рабіць у выпадку неабходнасці, праверку ведаў асобных настаўнікаў з прыцягненнем адпаведных спецыялістаў (прафесароў, дацэнтаў, выкладчыкаў, настаўнікаў і т. д.).

д) У адносінах да настаўнікаў, якія скончылі педагагічныя і прыроўненыя да іх навучальныя установы і прадставілі пасведчанні аб іх сканчэнні, атэстацыйныя камісіі выносяць заключэнне аб прысваенні ім званняў настаўніка і прадстаўляюць іх мне на зацвярджэнне.

е) Атэстацыйным камісіям праводзіць сваю работу непасрэдна ў раёнах, знаёмячыся з кожным настаўнікам не толькі па дакументах, але і па якасці яго работы ў школе.

ж) У адносінах парадку правядзення атэстацыйнай работы, характару праверкі ведаў асобных настаўнікаў і аб'ёму патрабаванняў да іх у гэтых выпадках прад'яўляемага, а таксама і ў адносінах парадку прадстаўлення матэрыялу па атэстацыях, атэстацыйным камісіям кіравацца зацверджанай мной спецыяльнай інструкцыяй.

5. У мэтах своечасовай падрыхтоўкі і паспяховага правядзення ўсёй работы па атэстацыі настаўнікаў, абавязаць загадчыкаў раённымі, гарадскімі і акруговымі аддзеламі народнай асветы неадкладна прыступіць да прывядзення ў парадак асабістых спраў на кожнага настаўніка (працоўны спіс, дакументы аб асвеце, характэрыстыка аб рабоце, аўтабіяграфія) з тым, каб да 20 мая 1936 г. скончыць гэту работу.

6. Скаргі настаўнікаў на рашэнні атэстацыйных камісій накіроўваць асабіста мне.

7. Старшыні атэстацыйных камісій павінны прадстаўляць мне на зацвярджэнне рашэнні атэстацыйных камісій аб прысваенні адпаведных званняў настаўнікам, якія прайшлі атэстацыю ў тэрміны, указаныя ў зацверджанай мною інструкцыі.

8. Лічачы самым важным абавязкам Наркомасветы, акруговых, гарадскіх і раённых аддзелаў народнай асветы аказанне ўсямернай дапамогі настаўніку ў справе павышэння яго агульнай і педагагічнай падрыхтоўкі, даручаю начальнікам кіраўніцтваў пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школы арганізаваць пры педагагічных і іншых навучальных установах спецыяльную падрыхтоўку для асоб, якія не атрымалі пры атэстацыі звання настаўніка і абавязаны прайсці дадатковы курс адукацыі ў парадку завочнага навучання, кансультацыі, спецыяльных курсаў, экстэрнату і т. д.

План работы па павышэнню кваліфікацыі настаўніцтва прадставіць мне на зацвярджэнне.

9. Звараючы ўвагу загадчыкаў акруговых, гарадскіх, раённых аддзелаў народнай асветы на выключную сур'ёзнасць справы правядзення атэстацыі настаўнікаў, абавязваю органы народнай асветы з усёй адказнасцю і ўвагай аднесціся да правядзення гэтай работы, бязлітасна знішчаючы якія-б там ні было спробы фармальна-бюракратычных адносін да настаўнікаў, праходзячых атэстацыю.

Паспяховае ажыццяўленне гэтай важнейшай задачы павінна яшчэ ў большай меры забяспечыць ўмовы, пры якіх совецкае настаўніцтва, акружанае выключнымі клопатамі і ўвагай ўрада, партыі і вялікага правадыра народаў т. СТАЛІНА, будзе змагацца за хутчэйшае аўладанне педагагічным майстэрствам і за ўздым усёй работы совецкай школы і выхаванне падрастаючага пакалення ў духу комунізма.

Народны камісар асветы БССР ДЗЯКАЎ.

Дадатак да загаду № 269 ад 5 мая 1936 г. па Народнаму камісарыяту асветы БССР

РАЗМЕРКАВАННЕ

гарадоў і раёнаў паміж атэстацыйнымі камісіямі па правядзенню атэстацыі настаўнікаў пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ.

№№ Склад камісіі	У якіх гарадах і раёнах праводзіць атэстацыю.
1. тт. Кузняцова (старшыня). Кравякоў, Маеўскі (члены камісіі).	Гор. Менск і раёны: Менскі, Талачынскі, Дзяржынскі, Заслаўскі, Смалявіцкі, Лагойскі, Пухавіцкі, Барысаўскі, Плешчаніцкі, Узд зенскі, Чэрвеньскі, Рудзенскі, Бярэзінскі, Крупскі, Халопеніцкі.
2. Тт. Башкевіч (старшыня), Лісейчыкаў, Ціханаў (члены камісіі).	Раёны Полацкай акругі (Полацкі, Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Расонскі), Віцебскі, Лёзнянскі, Гарадоцкі, Багушэўскі, Аршанскі, Круглянскі, Сіроцінскі, Суражскі, Бешанковіцкі, Сенненскі, Мехаўскі.
3. Тт. Грыневіч (старшыня), Рамановіч, Прудьнікава (члены камісіі).	Раёны Мазырскай акругі (Мазырскі, Даманавіцкі, Ельскі, Жыткавіцкі, Капаткевіцкі, Лельчыцкі, Нараўлянскі, Петрыкоўскі, Тураўскі), Гомельскі, Веткаўскі, Уваравіцкі, Рэчыцкі, Б.-Кашалёўскі, Чэчэрскі, Кармянскі, Цераховскі, Лоеўскі, Свяцілавіцкі, Камарынскі, Хойніцкі, Брагінскі, Добрушскі.
4. Тт. Панкевіч (старшыня). Кроль, Прэабражэнская (члены камісіі).	Раёны Лепельскай акругі (Лепельскі, Бягомльскі, Ушацкі, Чашніцкі), Магілеўскі, Быхаўскі, Бялыніцкі, Шклоўскі, Дубровенскі, Мсціслаўскі, Клімавіцкі, Касцюковіцкі, Чырвонапольскі, Чэрыкаўскі, Чавускі, Крычаўскі, Журавіцкі, Хоцімскі, Горацкі, Дрыбенскі, Прапойскі.
5. Тт. Ерафееў (старшыня), Беразоўскі, Раманчук (члены камісіі).	Раёны Слуцкай акругі (Слуцкі, Грэскі, Капыльскі, Любаньскі, Старобінскі, Чырвонаслабодскі), Старадарожскі, Бабруйскі, Кіраўскі, Глускі, Асіпавіцкі. Рагачоўскі, Парыцкі. Клічаўскі, Жлобінскі.

Народны камісар асветы БССР ДЗЯКАЎ.

9 мая г. г., у 7 гадзін веч., у памяшканні клуба імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

АДБУДЗЕЦЦА

чарговае пасяджэнне

ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГОРСОВЕТА

рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

ПАРАДАК ДНЯ:

Аб рабоце чыгуначнага вузла.

Білеты на пленум можна атрымаць у горсовеце (III паверх, пакой 49).

ПРЭЗІДЫУМ МЕНГОРСОВЕТА.

Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-І — 6 мая — ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ

Памяшканне польскага тэатра (Совецкая, 17, тэл. 25-153) — Гастролі тэатра Чырвонай арміі БВА 6 мая — СЛАВА

„Чырвоная зорка“ — ПАДРУГІ

„Пролетарый“ — Гукавы маст. фільм КАЛЯ САМАГА СІНЯГА МОРА

„Інтэрнацыянал“ — Гукавая вясёлая камедыя СВЯТА СВЯТОГА ІОРГЕНА

Кіно „Спартак“ — выдатны прыгодніцкі фільм ЗАЛАТОЕ ВОЗЕРА

7 МАЯ 7 МАЯ

ДЗЯРЖЗВЯРЫНЕЦ

у 8 гадзін вечара адбудзецца кармленне

ЗМЯІ—УДАВА

жывымі трусамі.

Звярынец змяшчаецца супроць Эльвода — уваход з Совецкай, 123.

БЕЛТАБАКГАНДЛЮ

ПАТРЭБНЫ

для пастаяннай работы ў Менску

планавік-фінансіст

і сакратар.

Звярачацца: пляц Волі, 4, Белтабакгандаль.

МІЖНАРОДНЫЯ ЗАВОЧНЫЯ СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

У маі адбудуцца завочныя міжнародныя спаборніцтвы стралковых клубаў. Умова спаборніцтва: кожнаму стралку з дробнакаліберпай вінтоўкі з становішча лежачы трэба выпусціць 40 куль па міжнароднай мішэні на адлегласці 50 метраў.

Ад БССР у спаборніцтвах будуць прымаць удзел дзве зборныя каманды стралкоў Менска. Зараз стралкі праходзяць трэніроўку. Лепшыя вынікі на трэніроўцы дала стаханаўка менскага тэлеграфа Ева Альпяровіч, якая з 400 магчымых выбіла 367 ачкоў. 10 мая каманды выйдуць у цір на завочныя міжнародныя стралковыя спаборніцтвы.

НОВЫ АТРАД ІНСТРУКТАРОЎ-ПАРАШУТЫСТАЎ

Нядаўна ў Віцебску закончыўся збор па падрыхтоўцы інструктароў-парашутыстаў другой катэгорыі. Скончыўшыя збор, пасля зацвярджэння загадам, будуць працаваць у якасці грамадскіх інструктароў і кіраваць гурткамі парашутыстаў першай ступені і прыжкамі з парашутных вышак. Усе парашутныя вышкі БССР будуць забяспечаны кваліфікаванымі кіраўнікамі.

Скончыўшыя збор засвоілі праграму на вельмі здавальняюча і добра і маюць прыжкі з самалёта. Увесь склад збору — стаханаўцы, 90 проц. — комсамольцы.

В. СЕРАБРОЎСКІ.

ЛЕТНІ СЕЗОН У ДАМАХ АДПАЧЫНКУ

Учора пасля зімовага перапынку і рамонту пачаўся летні сезон у дамах адпачынку соцстраха ЦСПСБ. У дамы адпачынку прыбылі 1.622 чал.

У параўнанні з мінулымі гадамі ў дамах адпачынку створаны значна лепшыя ўмовы для адпачынку і культурнага правядзення часу. Павялічаны выдаткі на ўтрыманне адпачываючых, у прыватнасці на харчаванне ў гэтым годзе будзе выдаткоўвацца 8 руб. 25 кап у дзень замест 6 руб. 20 к. у мінулым годзе.

У другім квартале дамы адпачынку прапусцяць 4.970 адпачываючых, у трэцім квартале—7.650. 18 мая адкрыюцца дамы адпачынку ў Драздах і ў Оршы, а ў канцы мая — дом адпачынку выхаднага дня ў Менску.

СПАБОРНІЦТВА БРАТОЎ ПІЛАТ

Камандзір узвода Н-скай часці, лейтэнант Макар Пілат выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва свайго брата, брыгадзіра калгаса «Чырвоны пагранічнік», Капыльскага раёна, Івана Пілат. Лейтэнант Пілат абавязаўся да канца навучальнага года падрыхтаваць свой узвод па ўсіх відах баявой і палітычнай падрыхтоўкі на вышэйшыя ацэнкі, а ад брата-брыгадзіра патрабаваў, каб яго брыгада ўзорна правяла сельскагаспадарчыя работы, дабілася высокага ўраджаю і т. д.

ПРЫЕЗД ДРАМАТУРГА БІЛЬ-БЕЛАЦЭРКОЎСКАГА Ў МЕНСК

У Менск прыехаў вядомы совецкі драматург тав. Біль-Белацэркоўскі. Мэта яго прыезду — сабраць матэрыял для напісання да 20-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі п'есы аб совецкіх пагранічніках. Сёння тав. Біль-Белацэркоўскі выязджае ў пагранічныя заставы для вывучэння жыцця і быту пагранічнікаў. Пісьменнік прабудзе ў БССР некалькі месяцаў.

ДАРОГА Ў ВІШНЯХ

ЦЕРАХОЎКА, 5 мая. **(Кар. «Звязды»).** Шырокай істужкай сцелецца новая дарога. Па баках яе леглі свежыя равы, пракапаныя ў гэтую вясну. Новая дарога будуецца калгасам «Пяскі», Глыбоцкага сельсовета. Паабапал дарогі пачынаюць распускацца дрэвы. Гэта вішня, якою абсаджана дарога. Праз тыдзень-два вішня зацвіце.

Вішнямі абсадзілі дарогу калгасніцы. Старшыня сельсовета тав. Громава была ініцыятарам гэтай карыснай справы. Уся дарога ад калгаса «Пяскі» да Паддабранскага сельсовета на адлегласці 7 кілометраў у вішнях. Таксама пачалі абсаджваць дарогу вішнямі калгаснікі Маркавіцкага сельсовета. Тут ужо абсаджана 5 кілометраў дарогі.

А. ЛОСЬ.

КУРСЫ ПА АБЯЗБОЛЬВАННЮ РОДАЎ

7 мая пры менскай гінекалагічнай клініцы пад кіраўніцтвам прафесара Выдрына пачнуць працаваць курсы па ўдасканаленню ўрачоў, акушораў-гінеколагаў, якія праводзяць абязбольванне родаў. На курсах апрача менскіх урачоў будуць навучацца ўрачы з 11 буйнейшых гарадоў БССР.

УСЕБЕЛАРУСКІ КРОС ІМЯ ШВЕРНІКА

Прэзідыум ЦСПСБ вынес пастанову аб правядзенні ўсебеларускага кросу імя Шверніка. У Менску крос будзе праведзен 18 мая у Віцебску, Гомелі, Оршы, Бабруйску, Барысаве, Магілеве, Полацку, Рэчыцы і Мазыры з 5 па 30 мая. Прэзідыум ЦСПСБ прапанаваў цэнтральным праўленням профсаюзаў, фабзаўмясцкомам прадпрыемстваў і навучальных устаноў разгарнуць масава-растлумачальную работу аб значэнні кросу і правесці падрыхтоўку ў выглядзе кросаў на прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Сталінскі РК КП(б)Б гор. Менска паведамляе, што згубленую кандыдацкую картку № 74844, выданую Капыльскім РК КП(б)Б на імя ДЗЕНІСЕНКА Сідара Сідаравіча, трэба лічыць несапраўднай.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Тыраж 90550 экз.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела №—Г4754.